ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЕРАДА, 10 ЖНІЎНЯ 1938 г. № 44 (386)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЯПОНСКАЯ ВАЕНШЧЫНА ЎЦЯГВАЕ ЯПОНІЮ Ў ВАЙНУ З СССР

Пачынаючы з 29 ліпеня, японская ваеншчына зрабіла рад правакацыйных нападаў на совецкую тэрыторыю ў раёне возера Хасан. У гэтых нападах удзельнічалі рэгулярныя японскія войскі, якія ўвялі ў дзеянне артылерыю ўсіх калібраў, у тым ліку і цяжкую. Гэтыя напады не могуць быць названы «пагранічным інцыдэнтам», як гэта прабуюць зараз у Японіі паказаць колы, звязаныя з ваеншчынай. Уварванне рэгулярных японскіх войск на совецкую тэрыторыю ў раёне возера Хасан прадстаўляе сабой яўную спробу японскай ваеншчыны ўцягнуць Японію ў вайну з Совецкім Саюзам.

Да 29 ліпеня на гэтым участку граніцы было нармальнае становішча. Але 29 ліпеня японскія рэгулярныя войскі ўварваліся на совецкую тэрыторыю і прабавалі захапіць сілай вышыню Безымянную. Гэты напад быў адбіт нашымі пагранічнікамі. Пасля гэтага японская ваеншчына сканцэнтравала тут дывізію рэгулярных войск з артылерыяй і 31 ліпеня, груба і бесцэрамонна парушыўшы дзяржаўную граніцу СССР, уноў папрабавала захапіць вышыні Безымянную і Заазёрную, бясспрэчна належачыя Совецкаму Саюзу. Называць падобнае дзеянне «пагранічным інцыдэнтам» па меншай меры смехатворна. Зусім ясна, што японская ваеншчына прадпрыняла падобныя дзеянні з адзінай мэтай — уцягнуць Японію ў вайну з Совецкім Саюзам.

Японская ваеншчына прабуе бесцэрамонна і груба шантажыраваць грамадскую думку Японіі і ўсяго свету, пусціўшы ў ход побач з рэгулярнымі войскамі і артылерыяй хлуслівыя сцверджанні аб тым, што раён возера Хасан нібы знаходзіцца на манчжурскай тэрыторыі. Гэтыя хлуслівыя сцверджанні падпальшчыкаў вайны былі выкрыты з самага пачатку. Як вядома, граніца паміж СССР і Манчжурыяй точна ўстаноўлена і зафіксавана Хунчунскім пагадненнем, заключаным паміж Расіяй і Кітаем у 1886 годзе, і прыкладзенай да пагаднення картай. Як пагадненне, так і карта точна ўстанаўляюць, што вышыні Безымянная і Заазёрная знаходзяцца на нашай тэрыторыі.

За сем год, прайшоўшых з часу акупацыі Манчжурыі японскімі войскамі, японская ваеншчына прымяняла самыя разнастайныя метады дыверсій і правакацый, каб ускладніць совецка-японскія адносіны і, у канчатковым рахунку, выклікаць вайну. Уварванне рэгулярных японскіх войск на совецкую тэрыторыю 31 ліпеня прадстаўляе сабой буйнейшую правакацыю, прадпрынятую з гэтай мэтай квантунскім штабам. Арганізатары гэтай наглай правакацыі рушылі на совецкую тэрыторыю рэгулярныя войскі з артылерыяй, таму, што яны разлічвалі такім шляхам запаліць пажар вайны.

4 жніўня японскі пасол у Маскве п. Сігеміцу заявіў у гутарцы з народным камісарам замежных спраў тав. М. М. Літвінавым, што японскі ўрад меў намер вырашыць інцыдэнт мірным шляхам, як лакальны. Але ўжо праз дзень пасля заявы п. Сігеміцу тав. М. М. Літвінаву японскія рэгулярныя войскі адкрылі інтэнсіўны агонь па совецкай тэрыторыі і, падтрыманыя шматлікай артылерыяй усіх калібраў, у тым ліку і цяжкай, пайшлі ў наступленне супроць совецкіх войск. Зразумела, совецкія войскі далі адпаведны адпор японскім часцям, самі перайшлі ў контрнаступленне і ачысцілі совецкую тэрыторыю ад астаткаў японскіх войск.

Японскія войскі зрабілі напад на совецкую тэрыторыю і на другім участку граніцы, у раёне Градэкава, атакавалі совецкі пагранічны нарад, абстралялі кулямётным агнём прыбыўшыя на дапамогу гэтаму нараду совецкія падмацаванні і занялі на совецкай тэрыторыі вышыню 588,3. Гэты напад таксама быў адбіт совецкімі войскамі, якія ачысцілі ўказаную вышыню ад японцаў.

Гэтыя новыя правакацыі, прадстаўляючыя сабой звенні адной цэпі, толькі сцвярджаюць неабвержна, што мэта японскай ваеншчыны — любымі сродкамі, аж да самых вызываючых і наглых, уцягнуць Японію ў вайну з Совецкім Саюзам.

Перад тварам гэтых правакацый, зацеяных японскай ваеншчынай, Совецкі Саюз аказаўся вымушаным прыняць адпаведныя контрмеры для абароны сваіх граніц. Совецкая тэрыторыя ачышчана ад астаткаў японскіх войск. Але дзе гарантыі, што японская ваеншчына не паспрабуе паўтарыць напад на совецкую тэрыторыю?

Таму, калі японскі ўрад сапраўды мае, як заявіў 4 жніўня японскі пасол Сігеміцу, «мірныя намеры», то ён павінен даць ясныя і точныя гарантыі, што напады на совецкую тэрыторыю не паўторацца. Ён павінен, нарэшце, абуздаць сваю ваеншчыну, якая не раз ужо ўцягвала пры дапамозе падобных правакацый Японію ў вайну з яе суседзямі. Няхай японскі ўрад прымусіць квантунскую і карэйскую арміі паважаць існуючую граніцу.

Японскі ўрад нясе адказнасць за афяры, паўшыя з абодвух бакоў у рэзультаце ваенных дзеянняў, пачатых японскай ваеншчынай супроць совецкіх войск на нашай тэрыторыі.

Совецкі Саюз не хацеў і не хоча вайны. Наадварот, ён імкнуўся і імкнецца да захавання і ўмацавання ўсеагульнага міру. Гэта з прадзельнай яснасцю выцякае з прапаноў, якія наступным чынам рэзюміраваў тав. Літвінаў 7 жніўня ў гутарцы з японскім пасломі:

«Ваенныя дзеянні спыняюцца пасля таго, як абодва бакі абавяжуцца не пераходзіць і не страляць праз пэўную лінію і адклікаць свае войскі, калі-б такавыя да моманту пагаднення апынуліся па той бок гэтай лініі. Такой лініяй прызнаецца граніца, паказаная на карце, прыкладзенай да Хунчунскага пагаднення, і такім чынам будзе аднаўлена становішча, якое існавала да 29 ліпеня, г. зн. да першага ўступлення японскіх войск на совецкую тэрыторыю».

Такая пазіцыя Совецкага Саюза. Яна праследуе толькі адну мэту — захаванне міру, аднаўленне спакою на граніцы і стварэнне ўмоў для папярэджання далейшых правакацыйных нападаў японскай ваеншчыны на совецкую тэрыторыю. Совецкі Саюз, аднак, не згаджаўся і не згодзіцца на перагляд граніцы.

Совецкі Саюз астаецца ў спакойнай упэўненасці ў свае сілы. Ён не жадае вайны. «Мы стаім за мір і адстайваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны» (Сталін).

Няма сумнення, што народныя масы Японіі, а таксама тыя элементы правячага лагера, якія трэзва ацэньваюць міжнароднае і ўнутранае становішча сваёй краіны, не зацікаўлены ў вайне з Совецкім Саюзам. Трэба думаць, японская ваеншчына аб гэтым добра ведае. Але, відаць, іменна таму авантурысты, якія стараюцца ва што-б та ні стала ўцягнуць Японію ў вайну з Совецкім Саюзам, заходзяць усё далей і далей у сваіх правакацыйных дзеяннях.

Ацвярозваюча павінна падзейнічаць на японскіх імперыялістаў цвёрдая заява народнага камісара замежных спраў тав. Літвінава аб тым, «што совецкі ўрад не намеран надалей дапускаць беспакаранае перыядычнае знішчэнне і ганенне яго пагранічнікаў, або хаця-б часовае заняцце совецкай тэрыторыі японскімі войскамі, і што ён поўны рашучасці надалей, у падобных выпадках, прымяняць самыя суровыя меры, уключаючы скарыстанне артылерыі і авіяцыі».

Пазіцыя, занятая совецкім урадам, знаходзіць аднадушнае падтрыманне народаў СССР. Як паказваюць водгукі міжнароднага друку на правакацыі японскай ваеншчыны, пазіцыя Совецкага Саюза падзяляецца таксама народнымі масамі і міралюбівымі коламі ва ўсіх краінах. Гэта і зразумела, бо цвёрды адпор, даны Совецкім Саюзам японскай ваеншчыне, якая імкнецца да вайны, і непахісная ўпэўненасць, якой іспоўнен увесь совецкі народ, служаць справе і інтарэсам усеагульнага міру.

(«ПРАВДА»).

ПАВЕДАМЛЕННЕ ШТАБА ПЕРШАЙ (ПРЫМОРСКАЙ) АРМІІ

Праз дзень пасля «мірнай» прапановы пасла Сігеміцу тав. Літвінаву 4 жніўня гэтага года. японскія войскі за возерам Хасан адкрылі інтэнсіўны агонь па совецкай тэрыторыі. Шматлікая артылерыя ўсіх калібраў, у тым ліку цяжкая, страляла з тэрыторыі Манчжоў-Го і прыкрывала дзеянні японскай пяхоты, якая ішла ў наступленне супроць совецкіх войск. Совецкія войскі адкрылі ў адказ артылерыйскі агонь. Пасля 3—4-гадзіннай артылерыйскай дуэлі, у выніку якой японская артылерыя была падаўлена. совецкія часці пры ўдзеле совецкай авіяцыі пайшлі ў контрнаступленне і ачысцілі нашу тэрыторыю ад астаткаў японскіх войск. заняўшы трывала нашы пагранічныя пункты.

УВЕСЬ СОВЕЦКІ НАРОД ГАТОЎ АБАРАНЯЦЬ СВАЮ СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ РАДЗІМУ



3 жніўня 1938 г. адбыўся мітынг летчыкаў, тэхнікаў і курсантаў Менскага аэраклуба ў сувязі з правакацыйнымі дзеяннямі японскай ваеншчыны.

Яшчэ энергічней правядзем вучобу і на выдатна авалодаем авіяцыйнай тэхнікай, і калі трэба будзе, разам са слаўнай Чырвонай Арміяй усе як адзін станем стальною сцяной на абарону квітнеючай радзімы. Так заявілі ўдзельнікі мітынга ў прынятай рэзалюцыі.

НА ЗДЫМКУ: момант галасавання рэзалюцыі.

Фото Мазелева (СФ).

ЯПОНСКІМ САМУРАЯМ

Грозіць мікада Советам,
Хоча мікада вайны.
Ох, не зазнае прасвету,
Светлай не ўбача вясны!

Марш паграбальны сырэны
Зграюць яму на вайне,
Дым спаўе Токіо сцены,
Мора палацы глыне.

Разам з крывавай каронай
Скоціцца з плеч галава,
Будзе касцёр з яго трону,
Будзе калом булава.

* * *

Мы свае межы, граніцы
Пільна вартуем, глядзім,
Нашай свабоднай зямліцы
У крыўду, ў палон не дадзім.

Земляў чужых мы не хочам,
Землі ўбаронім свае, —
Чорную сілу зламочым,
Хай толькі нас закране!

За кожную кроплю пралітай
Нашай нявінна крыві
Мора крыві мы з бандытаў
Выллем на іхняй зямлі.

* * *

Арміі нашай чырвонай
Вострa наточаны штых,
Порах сухім у патронах
Дзержыць баец большэвік.

Нашых гарматаў прыцэлы
Б'юць без прамахаў у цэль,
Бандзе сляпнёў азвярэлых
Смерцю пасцелюць пасцель.

Нашы арлы самалёты
Ворагу сонца зацмяць,
Злыя варожыя роты
Бомбамі ўтопчуць у гаць.

* * *

І рыхтаваць не пасмее
Указаў мікада для нас, —
Зброду японскіх зладзеяў
Выдадзім мы свой указ.

П'яных разнёй самураяў,
Хэўру фашыстаўскіх орд —
Знішча ўсю гэтую зграю
Вольны совецкі народ.

Ліпца не будзе нявінна
Кроў па зямлі ручаём,
Будуць народы. краіны
Жыці шчаслівым жыццём.

ЯНКА КУПАЛА.

Гарадзішча.
Жнівень, 1938 г.

СМЕРЦЬ ФАШЫСЦКІМ ПСАМ

Калектыў работнікаў Беларускага тэатра оперы і балета выражае глыбокае абурэнне з прычыны наглага правакацыйнага нападу японскіх фашысцкіх разбойнікаў на тэрыторыю нашай свяшчэннай радзімы.

Мы запэўняем партыю. урад і таварыша Сталіна ў тым, што па першаму закліку ўсе, як адзін. станем у рады Чырвонай Арміі і аддадзім усе свае сілы. усе свае веды, і калі патрэбна будзе, дык і жыццё на абарону цудоўнай радзімы.

Смерць фашысцкім псам. якія імкнуцца пераступіць нашы рубяжы!

Мы вітаем доблесных байцоў Чырвонасцяжнага Далёкаўсходняга фронта, якія даюць сакрушаючы адпор японскай ваеншчыне.

Прывітанне нашым слаўным пагранічнікам. якія зорка ахоўваюць кожную пядзь совецкай зямлі!

Калектыў Беларускага тэатра оперы і балета.

ПРЫЗВАЦЬ ДА ПАРАДКУ ЗАРВАЎШЫХСЯ САМУРАЯЎ

Заслухаўшы паведамленне аб падзеях на Далёкім Усходзе, на совецка-манчжурскай граніцы, агульны сход работнікаў Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача з абурэннем уздымае свой голас пратэсту супроць наглай правакацыйнай палітыкі японскага фашызма, які пагражае чалавецтву новай крывавай бойняй.

Совецкі народ, як ніколі, згуртаваны вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, вакол совецкага ўрада.

Нашы граніцы недатыкальны. «Ні адной пядзі чужой зямлі не хочам. Але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддадзім нікому» **(Сталін).** Няхай памятаюць японскія фашысты, што гэта ім дарма не пройдзе і што яны заўсёды атрымаюць сакрушальны адпор.

Мы, работнікі Тэатра юнага гледача, далучаем свой голас пратэсту да голасу 170-мільённага народа Совецкага Саюза і патрабуем ад нашага ўрада рашучых мер па абузданню зарваўшыхся японскіх самураяў.

Абавязваемся яшчэ больш умацоўваць абароназдольнасць нашай доблеснай Чырвонай Арміі, узброіцца ваеннымі ведамі і па першаму закліку партыі і ўрада выступіць на абарону заваёў соцыялістычнай рэволюцыі.

Няхай жыве наша слаўная і магутная Чырвоная Армія і яе сталінскі жалезны нарком абароны тав. К. Е. Варашылаў!

Няхай жыве ЦК ВКП(б)!

Няхай жыве правадыр сусветнага пролетарыята, арганізатар нашых перамог, дарагі і любімы наш Сталін!

БУДЗЕМ МАЦАВАЦЬ МАГУТНАСЦЬ СОВЕЦКАГА САЮЗА

Заслухаўшы інфармацыю аб правакацыйным нападзе японскіх фашыстаў-самураяў на совецкую тэрыторыю, калектыў работнікаў Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР абураны гэтым наглым фашысцка-бандыцкім выпадам падпальшчыкаў вайны.

Калектыў упэўнен у тым. што партыя і совецкі ўрад прымуць усе меры для абароны нашай радзімы і для адпору японскім фашыстам і іх зладзейскім правакацыям.

Мы вітаем нашых слаўных выхаванцаў вялікага Сталіна — байцоў і камандзіраў Чырвонасцяжнага Далёкаўсходняга фронта — патрыётаў соцыялістычнай радзімы.

Мы запэўняем партыю Леніна — Сталіна і совецкі ўрад, што мы ўсёй сваёй работай будзем мацаваць магутнасць квітнеючага Совецкага Саюза і ў любую хвіліну гатовы ўліцца ў рады нашай непераможнай доблеснай Чырвонай Арміі і грудзьмі стаць на абарону сваёй радзімы.

Калектыў Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.

УСЕ, ЯК АДЗІН, СТАНЕМ НА АБАРОНУ СВАЁЙ РАДЗІМЫ

Мы. работнікі цырка, абураныя правакацыйнай вылазкай фашысцкай японскай ваеншчыны. заяўляем, што па першаму закліку партыі і ўрада ўсе, як адзін, станем на абарону сваёй радзімы.

Гнусныя спробы фашыстаў навязаць нам вайну абавязваюць нас мабілізавацца на барацьбу за яшчэ большыя поспехі на фронце мастацтва і яшчэ цясней згуртавацца вакол нашай партыі і роднага таварыша Сталіна.

Калектыў цырка.

ДА СУТЫЧАК У РАЁНЕ ВОЗЕРА ХАСАН

Японскі пасол п. Сігеміцу сёмага жніўня зноў наведаў Народнага камісара замежных спраў тав. Літвінава. Скарыстаўшы гэты выпадак. тав. Літвінаў напомніў паслу, што некалькі дзён таму назад апошнім была зроблена ад імя японскага ўрада прапанова аб спыненні ваенных дзеянняў, і што на гэта яму было адказана, што, як толькі спыняцца напады і абстрэлы з манчжурскай стараны, совецкая старана не будзе мець патрэбы прыбягаць да ваенных дзеянняў у адказ. Такім чынам. спыненне ваенных дзеянняў залежала выключна ад японскай стараны. На жаль. на другі-ж дзень былі паўторныя напады японскіх войск на совецкую тэрыторыю. узнавіўся артылерыйскі абстрэл, у тым ліку абстрэл з цяжкіх гармат. з тэрыторыі Манчжурыі. што вымусіла совецкую старану адказаць артылерыяй і пусціць у ход авіяцыю. Хаця японскія атакі былі адбіты і астаткі японскіх часцей выцеснены з совецкай тэрыторыі, нельга не пашкадаваць аб здарыўшымся і не ўскласці на японскі ўрад адказнасць за афяры з абодвух бакоў. Тав. Літвінаў адзначыў, што ў прымяненні да сутычак у раёне возера Хасан нельга гаварыць аб пагранічным інцыдэнце, мяркуючым сутычкі паміж пагранічнымі салдатамі. У пагранаховы звычайна артылерыі не бывае. у даным-жа выпадку першае наступленне японцаў было прадпрынята з дапамогай артылерыі. Як відаць, мела месца спроба захваціць у мірны час совецкую тэрыторыю або нават уцягнуць Японію ў вайну з СССР. Адсюль ўся небяспека дадай сутычкі. на якую японскаму ўраду трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу. На заўвагу п. Сігеміцу, што японскія войскі займаюць толькі абаранянальную пазіцыю, маючы абавязак абараняць манчжурскую тэрыторыю, тав. Літвінаў запярэчыў, што на японскую тэрыторыю ніхто не нападаў і нападаць не збіраўся і што японскія войскі, як відаць. маюць дзіўнае ўяўленне аб абароне, калі яны пад гэтым разумеюць напад на совецкія заставы, артылерыйскі абстрэл іх і заняцце лініі на совецкай тэрыторыі.

П. Сігеміцу паведаміў, што ён прышоў з мэтай паўтарыць сваю прапанову аб спыненні ваенных дзеянняў войскамі абодвух бакоў, якія павінны аставацца ў тым палажэнні, у якім іх застане пагадненне. Услед за гэтым, па яго думцы, можна будзе прыступіць да стварэння камісіі з прадстаўнікоў СССР і Манчжоу-Го, пры ўдзеле японцаў, для вызначэння граніцы. Тав. Літвінаў указаў, што палажэнне на месцы можа мяняцца, і абедзве стараны будуць імкнуцца заняць найбольш выгадную пазіцыю к моманту пагаднення, што азначае працяг ваенных дзеянняў. Ва ўсякім выпадку ніякае пагадненне, калі на совецкай тэрыторыі астанецца хоць-бы нязначная японская воінская часць, немагчыма. Зараз яе няма, але яна можа там зноў з'явіцца, калі прыняць прапанову пасла. Калі японская старана гарантуе к пэўнаму часу спыненне нападаў на совецкую тэрыторыю і стральбы з манчжурскай тэрыторыі, то совецкая старана дасць такія-ж гарантыі ў адносінах манчжурскай тэрыторыі.

П. Сігеміцу доўга настойваў на сваёй прапанове аб спыненні ваенных дзеянняў на аснове стварыўшагася к пэўнаму моманту фактычнага палажэння і затым высунуў прапанову аб адводзе войск з абодвух бакоў на пэўную аддегласць. Для рэдэмаркацыі граніцы п. Сігеміцу прапанаваў карыстацца як Хунчунскім пагадненнем, так і іншымі матэрыяламі, якія могуць знаходзіцца ў Манчжоу-Го або ў Японіі.

Тав. Літвінаў сказаў, што, паколькі японскія войскі напалі на совецкую тэрыторыю і гэтым выклікалі канфлікт, можна было-б вітаць адвод іх падальш, для ўнікнення паўторных нападаў. і гэта было-б дадатковай гарантыяй. Няма, аднак. ніякіх падстаў для адводу совецкіх войск, якія ўвесь час знаходзіліся і знаходзяцца выключна на сваёй тэрыторыі і Манчжурыі не пагражаюць. Рэдэмаркацыя граніцы павінна быць зроблена выключна на аснове існуючых міжнародных пагадненняў. Совецкім урадам прад'яўлена Хунчунскае пагадненне. і толькі яно і можа легчы ў аснову рэдэмаркацыі, калі Манчжоу-Го або Японія не прад'явяць больш позняга пагаднення, заключанага паміж Расіяй і Кітаем. Але такога не існуе. Ніякія іншыя матэрыялы не могуць мець уплыў на вызначэнне граніцы.

Тав. Літвінаў рэзюміраваў сваю прапанову наступным чынам. Ваенныя дзеянні спыняюцца пасля таго, як абедзве стараны абавяжуцца не пераходзіць і не страляць праз пэўную лінію і адклікаць свае войскі, калі-б такавыя к моманту пагаднення апынуліся па той бок гэтай лініі. Такой лініяй прызнаецца граніца, паказаная на карце. прыкладзенай да Хунчунскага пагаднення, і такім чынам будзе адноўлена палажэнне, якое існавала да 29 ліпеня, гэта значыць да першага ўступлення японскіх войск на совецкую тэрыторыю. Па ўстанаўленні спакою на граніцы туды выязджае двухбаковая камісія ў саставе з аднаго боку — двух прадстаўнікоў ад СССР, а з другога боку — аднаго ад Японіі і аднаго ад Манчжурыі і прыступае на месцы да рэдэмаркацыі граніцы, устаноўленай Хунчунскім пагадненнем, прыкладзенымі да яго пратаколамі і картай. Пасол абяцаў абдумаць змест меўшай месца гутаркі і вярнуцца да яго.

Пасля гэтага тав. Літвінаў зрабіў паслу наступную заяву. У той час, як японскі ўрад выступіў з прапановай аб спыненні ваенных дзеянняў на адным участку граніцы, на другім участку. на гэты раз ужо ў раёне Гродэкава. японская рота з трыма станкавымі кулямётамі раптоўна атакавала совецкі пагранічны нарад, які ахоўваў вышыню 588,3. якая знаходзіцца на совецкай тэрыторыі, і заняла яе. Прыбыўшыя ў хуткім часе совецкія падмацаванні былі абстраляны кулямётным агнём з боку японскай роты, скрыўшайся на манчжурскай тэрыторыі, пакінуўшы на вышыні 10 японскіх гранат і 50 каўпачкоў ад гранат. У часе бою было забіта і ранена некалькі чырвонаармейцаў. Ёсць. відавочна, забітыя і раненыя і з японскага боку. Пасля мноства пратэстаў з поваду аналагічных выпадкаў было-б бескарысна абмежавацца новым пратэстам. З прычыны гэтага прадстаўляецца неабходным заявіць, што совецкі ўрад не намеран надалей дапускаць беспакаранае. перыядычнае знішчэнне і параненне яго пагранічнікаў, або хаця-б часовае заняцце совецкай тэрыторыі японскімі войскамі, і што ён поўны рашымасці надалей у падобных выпадках прымяняць самыя суровыя меры, уключаючы выкарыстанне артылерыі і авіяцыі. Няхай японскі ўрад прымусіць квантунскую і карэйскую арміі паважаць існуючую граніцу. Час пакласці канец бясконцым «інцыдэнтам» і сутычкам на граніцы.

(ТАСС).

АКТОРЫ

НАВЕЛА

Раз'язная брыгада актораў палітаддзела адной з стралковых дывізій, якая абслугоўвала часці на пазіцыях, трапіла ў палон. Брыгаду складалі ўсяго чатыры акторы.

Італьянская спявачка Джыльда Дэльвары, невядома якім чынам трапіўшая ў армейскія актрысы, выконвала свой рэпертуар на італьянскай і ламанай рускай мовах. Яна была вельмі прыгожая і ўладала надзвычайнай каларатурай, якая ўдала спалучалася з акампаніментам баяна. У яе былі чорныя, як воранава крыло, валасы і вялікія блакітныя вочы. Рускую мову яна разумела, але гаварыла па-руску дрэнна. Другім па «важнасці» жанраў быў барытон Чэхольцаў, празваны «імператарскім» салістам за напышлівую манернасць і заўсёдны выхвальны тон. Ён уладаў такой самаўпэўненасцю і так задаваўся, што ледзь не па самой справе лічыў сябе былым імператарскім салістам. Як трапіў ён у армейскія акторы,—цяжка сказаць. Васька Муратаў быў чытальнікам. У акторы ён трапіў, бадай што, выпадкова. Аднойчы яму прышлося, калі ён быў у запасным кавалерыйскім дывізіёне ў гор. Магілеве, выступаць у гарнізонным клубе на своеасаблівым чырвонаармейскім самадзейным канцэрце. Яго выступленні бачыў прадстаўнік палітаддзела арміі і, такім чынам, лёс Ваські быў вырашан. Ён стаў, воляй грамадзянскай вайны і палітаддзела арміі, артыстам-прафесіяналам. Кудра-Бяроза, празваны так за прывычку лаяцца словамі: «рас-ты-Кудра-на-растак-бяроза», выконваў абавязкі трох асоб. Ён нёс у сабе функцыі брыгадзіра-адміністратара, акампаніятара і саліста на баяне. Мянушку «Кудра-Бяроза» ён любіў. Сапраўднае яго імя было—Іван Філіпавіч Тугаухаў, але так яго ніхто ніколі і не клікаў і не ведаў.

У брыгадзе склаліся адносіны: Кудра з Васькай у дружбе—вадой не разліць. Джыльда—ні тое, ні сёе. Барытон «імператарскі» пана з сябе корчыў. А Кудру на гэта было напляваць—брыгада працавала спраўна, сварак і сутычак паміж яе членамі не было,—ну, і добра.

Яны на прывале давалі канцэрт. Не паспеў праспяваць Чэхольцаў «Як кароль ішоў на вайну»,—байцы сталі падымацца. Быў атрыман экстранны загад на выступленне. І, знаходзячыся на начлегу ў вёсцы вёрст за восем ад фронта, яны раніцой аказаліся ў руках палякаў. Гэта было так нечакана, што аб уцёку нават не было калі і падумаць. Спалі ў адной хаце; калі Васька прачнуўся—Чэхольцава не было. Ён на гэту абставіну не звярнуў увагі. А праз некалькі хвілін «імператарскі» саліст вярнуўся... з польскімі салдатамі.

Дапытвалі трох — Ваську, Кудру і Джыльду разам. Чэхольцаў кудысьці адразу знікнуў. З Ваською гаварылі мала, пасуліўшы яму расстрэл. Кудру-Бярозе прапанавалі стаць музыкантам, паабяцаўшы за гэта жыццё. Адбылася сцэна размовы, дзе Кудра ў злосці вылаяў палякаў і іграць наадрэз адмовіўся. Ён змоўкнуў толькі тады, калі атрымаў выспятак пад дзевятае рабро—ногі ў паручыка даўгія, дасталі. На даяўчыну паручык доўга і плотаядна глядзеў, потым адвёў яе да палкоўніка, дзе за «вядомую ласку» з боку Джыльды ёй была абяцана прыхільная ўвага да яе далейшага жыцця. Яна выйшла ад палкоўніка пачырванеўшая, ледзь стрымліваючы гнеў; следам за ёю вышаў збянтэжаны паручык. Сваім таварышам па няшчасцю аб сваіх паводзінах з палкоўнікам яна так нічога і не расказала.

***

Іх усіх, акрамя «імператарскага» саліста, пасадзілі ў гумно і прыставілі двух вартавых. Надыходзіў позні майскі вечар. Здалёку даносіўся гул гармат і ледзь чутныя кулямётныя трэлі. Фронт аддаляўся кудысьці ўлева і надзея на выратаванне, якая цеплілася ў кожным з іх у пачатку палону, цяпер згасла зусім. Толькі што прыходзіў гэты выцягнуты, худы як жэрдка, паручык з наглымі, на выкаце, вачыма і абвясціў загад пана палкоўніка. «Іх заўтра раніцою расстраляюць, як шпіёнаў». Паручык шматзначным позіркам прапанаваў Джыльдзе тое, аб чым з ёю гаварыў раніцою на допыце. Ваську здалося, што Джыльда павінна згадзіцца, бо яна доўга і ўважліва глядзела на афіцэра. Ён адвярнуўся, ледзь стрымаўшы ўздых. Ён і чакаў і не чакаў гэтага ад Джыльды. Наогул яна для яго была незразумелай. А Кудра-Бяроза з-пад ілба разглядаў іх абодвух, і афіцэра і Джыльду. Твар Джыльды пачырванеў, гэта было відаць нават пры цьмяным водбліску ліхтара, і яна, гнеўна бліснуўшы позіркам, адвярнулася. Васька гэта хутчэй адчуў, чым убачыў. Афіцэр ляснуў шпорамі і ў суправаджэнні салдата, трымаўшага ліхтар, выйшаў з гумна. Па варотах гумна ўдарыла жалезная засаўка і шчоўкнуў у замку ключ.

Трое людзей маўчалі. Яны былі скаваны адным лёсам і кожны з іх адчуваў вялікую блізкасць аднаго да другога, аднак, не паказваў гэтага. Маўчанне было насцярожаным і кожны баяўся яго патрывожыць...

Першым загаварыў Кудра-Бяроза. Ён гаварыў, быццам ні да каго не звяртаючыся, а разважаючы сам з сабою:

— Ну, скажам, я—Кудра-Бяроза, тульскіх крывей рабочы, гарманіст прысяжны, салдат рэвалюцыі—па загаду Советаў узброены гармонікам, таму сілы ён вялікай у маіх руках; ці, скажам, Муратаў Васька, пралетарый, артыст, высунуты чырвонаармейскай масай, які запальвае словам сваім узвод, роту, батальён... А, вось, Джыльда, дык гэта-ж дзіцё, закінутае недарэчным паваротам лёсу з Італіі ў Расію, за грахі бацькоў сваіх і, так сказаць, ненашынскага яна духу асоба. Я-б не вінаваціў яе, калі-б яна, скарыстаўшы зробленую ёй прапанову, пакінула час.

Ён памаўчаў, чакаючы адказу Джыльды. Але пасля яго слоў настала ранейшае маўчанне. Былі чутны голькі крокі вартавых. Здалёку даносіўся грукат колаў казённай павозкі.

Кудра-Бяроза, глыбока ўздыхнуўшы, дадаў: — а баян, вось, пабаяліся адабраць, не забыліся, а пабаяліся; і ўдарыць, вось, не адважыліся. Далікатнасць да артыстаў.

— Ды цябе-ж, Кудра-Бяроза, афіцэр наском бота пад рабро ўдарыў, што-ж ты маніш — пабаяліся, — з цемры раздаўся голас Ваські.

— Дык гэта-ж я давёў яго да лютасці, гэта не ў лік... Гэта, брат, не ў лік. А спрытна я яму сказаў, калі ён хацеў прымусіць мяне для салдатаў іграць. Я яму кажу: не для таго, гавару, я ў Туле нарадзіўся і на заводзе вырас, каб усякай сволачы паляцкай на баяне ігру даваць... Эх, каб цяпер, вось, замест баяна вінта мне... Бывай тады, Тула і ўся калужская старана, трымайся шляхта...

Зноў настала цішыня. Арыштаваныя панікнулі галовамі. За варотамі гумна адбывалася змена вартавых.

Мінула яшчэ некалькі хвілін напоенай цемраю цішыні.

І раптам, быццам нехаця, нябачаная рука прайшлася цяжкімі пераборамі па галасах баяна, рэзка і мінорна. Потым цішыню напоўнілі гамы музыкальных фарбаў, і баян заспяваў. Гэта была і не тужлівая і не вясёлая мелодыя, падобная на нейкі знаёмы рускі матыў, адзін з тых шматлікіх матываў, створаных невядомымі аўтарамі на ўскраіне фабрычнага горада. Такія матывы напамінаюць многія мелодыі адразу, але не адразу пазнаць іх. Гэта была музыка, ад якой ногі і не пойдуць у прыскачкі, але робіцца бадзёра на душы.

Васька зразумеў — Кудра-Бяроза хоча іх падбадзёрыць. Кудра-Бяроза іграў усё больш і больш натхняючыся. Крокі вартавых сціхнулі, было зразумела, што яны, стрымліваючы дыханне, слухалі. Вельмі ўжо спрытна іграў Кудра.

Васька адчуў, як на яго плячо легла рука: гэта была Джыльда. Яна нячутна падышла да яго. Не змяняючы позы, ён пагладзіў сваёй рукой руку Джыльды. Цяпер ён адчуў, як Джыльда злёгку дакранулася да яго шчакі тварам, валасамі; шчокі яе былі мокрыя. Яна, прытуліўшыся галавой да пляча Ваські, абняла яго за шыю рукой. Грудзі яе ўздрыгнулі. Слёзы падалі на шыю Ваські і каціліся за каўнер расшпіленай гімнасцёркі.

Васька ціха-ціха, каб не парушыць ліючайся з баяна мелодыі, прашаптаў: — Джыльдачка, мілая Джыльдачка, плачце; які добры вечар, а заўтра мы памрэм; плачце, Джыльдачка.

А Кудра цяпер іграў такое задушэўнае, быццам плакала душа ад радасці, ці на ранішнім сонцы расла пад расой трава і спявалі жаўранкі, і якбы чалавек вырваўся з вільготнай цямніцы на волю і ніяк не мог надыхацца квітучым вакол прыволлем, прасторам, і вось перад ім хвалі ракі іграюць у гарэзлівым плеску...

Каля гумна сабраліся па аднаму салдаты. Іх цягнула да гумна музыка. Але яны, асцярожна аглядаючыся на вартавых, блізка не падыходзілі, а тыя рабілі выгляд, што іх не заўважаюць.

***

Іх вялі расстрэльваць на зады, за гумно. Ішоў Кудра, несучы ў руках баян, і сумна разглядаў зямлю. Ішла Джыльда, моўчкі, па твары яе скатваліся рэдкія слязінкі. А за імі Васька, дзіўна ўсміхаючыся, перабіраючы нягучна губамі.

У гэты час тыл польскай пазіцыі, распалажаны ў вёсцы, дзе адбываліся гэтыя падзеі, парушылі трывожныя гукі сігнальнага горна, і ў адно імгненне ўсе замітусіліся, аж да канвоя суправаджаўшага актораў да месца расстрэлу. Пачуліся зусім блізка, у канцы вуліцы і на задворках, стрэлы. Вёска заварушылася. Салдаты спяшаліся хутчэй выканаць загад пана палкоўніка і вырашылі пакончыць з акторамі, не давёўшы іх да маста.

Шасцёра салдатаў сталі, не дайшоўшы да канца задворкаў, і толькі цяпер заўважылі што пан паручык кудысьці бясследна знікнуў. У гэты час да загарожы здалёку, па полі, беглі чырвонаармейцы. Салдаты спалохана пераглянуліся. «Храбрым» жаўнерам нічога не заставалася рабіць, як кінуцца ўрассыпную, прадаставіўшы актораў самім сабе.

Радасна сустрэлі нашы акторы чырвонаармейцаў. Джыльда плакала і смяялася ад радасці. На твары ў Ваські цвіла ўсмешка. А Кудра даводзіў ім абодвум, што няма на свеце чалавека жывучай за іх і прывёў прыклад, як аднойчы ён быў так збіты, што дактары сказалі: лячыць не трэба, так памрэ. А ён праз трое сутак на ногі ўзняўся — і ўсё калецтва з пабоямі як рукой зняло.

Чэхольцаў, убачыўшы групу байцоў, хутка набліжаўся да іх. Ён, з уласцівым яму тэатральным пафасам, узняў да гары рукі і сказаў: — дарагія, сябры мае, змагары за рэвалюцыю, я быў у палоне і наступала смерць мая, і вы, толькі вы... Ён не дагаварыў. З натоўпу выйшаў Кудра... Чэхольцаў быў упэўнены, што з яго калегамі ўжо ўсё скончана. Твар барытона збляднеў, стаў шэрым, ён схапіўся за сэрца і, панікнуўшы галавой, зрабіўся адразу якімсьці маленькім, незаўважным. Рукі яго безжыццёва павіснулі.

У яго цяпер было адно жаданне — пайсці, куды заўгодна, але пайсці... хоць-бы скрозь зямлю, але ўцячы.

— Эх, ты, гніда... — сказаў Кудра-Бяроза і, адвярнуўшыся, плюнуў.

Увага ўсіх была адцягнута праходзіўшай па вёсцы кавалерыяй, якая ішла дабіваць ворага. А адкульсці здалёку даносіліся гукі рвучайся ў вышыню чырвонаармейскай песні.

Улад. ГЛАЗЫРЫН.



На тактычным вучэнні Чырвонай Арміі.
НА ЗДЫМКУ: баец ля кулямёта.

Анатоль Астрэйка

ДЗЕД і ЎНУКІ

(З цыкла вершаў пра гераічную барацьбу іспанскага народа супроць фашысцкай інтэрвенцыі)

Старэнькі сівы дзед
Змахнуў слязу дрыжачаю рукою
І на парог прысеў
Знямелы,
Абяссілены ад болю.

І тут-жа, на двары
Яго навокал абступілі дзеці,
І думаў дзед:
— Няўжо ім жабраваць ісці па свеце?

Ну, што цяпер рабіць,
Дзядулю сіваму куды падацца?
Загінуў у баях
За права жыць
Малых унукаў бацька.

З вінтоўкаю ў руках
Пайшла на фронт
Дзяцей надзея — маці.
Застаўся дзед адзін
З смуглявымі любімцамі ў хаце.

Праводзіў за сяло
Нявестку ён,
Матулю малышоў-унукаў.
І мо' апошні раз
Сыноў тулілі матчыныя рукі.

Калі на фронт ішла,
Каб помсціць люта ворагу ліхому,
Адзіная сляза
Упала ёй
На горла горкім комам.

І ціха дзед сказаў
Сваёй нявестцы ўслед
На развітанне:
— Ідзі, дачка мая,
Бывай, дачка!
Да хуткага спаткання.

Тут недалёка бой
І ветры, як на зло, сіберна дзьмулі,
І падалі, як снег
На галаву,
Свінцом гарачым кулі.

Ці прыдзе зноў яна,
Ці вернецца матуля дарагая?
І дзед сваё жыццё,
Нібыта сон забыты, ўспамінае.

Палеглі спаць даўно
Унукі дзедавы — малыя дзеці.
Як цёмна на двары,
Як неспакойна стала жыць на свеце.

Грыміць, не ціхне гром
І зарава стаіць на небасхіле, —
Не гром, а гул гармат,
Пажар вакол
Ад бомбаў з эскадрыльяў.

Драпежнікі прышлі,
Што страцілі і воблік чалавечы.
Каб гвалт чыніць,
Каб люд іспанскі нішчыць і калечыць.

Жахлівая вайна
Да хаты дзедавай
Падходзіць блізка.
І вёскі, гарады
На кроў і смерць асвенчвае епіскап.

Але сцяной народ,
Няломнаю сцяной
Вядзе змаганне,
Іспанія дае адпор,
Іспанія свабодным краем стане!

***

Старэнькі сівы дзед
Сядзеў на прызьбе
Каля хаты крукам.
Калі байцы прышлі,
А з імі —
Маці родная унукаў.

Ён радасна слязу
Змахнуў з вачэй
Мазольнымі рукамі,
Калі баец сказаў:
— Не будуць, дзед, унукі жабракамі!



«Іспанка». Скульптура работы Галіны Петрашэвіч (Кіеў) на выстаўцы твораў мастакоў Украінскай ССР у Цэнтральным парку культуры і адпачынку імя Горкага ў Маскве.

М. Паслядовіч

У ЗАЕЗДЖЫМ ДОМЕ

(Урывак з рамана)

Віктар стаяў пад разгалістым таполем на станцыі і чакаў поезда з Менска. Адзінокія прахожыя, як здані, прашмыгалі паўз яго і знікалі за рогам вакзала. Маўкліва было на гэтым невялікім прычыгуначным пасёлку. Рэдка ў якім доме мігцелі слабыя агні. Недзе ў садзе, каля двухпавярховага драўлянага дома, пачуўся і зараз-жа аціх п'яны голас:

На една слова я цёгле чэкам,
Цо то за слово—ты добра веш.

І толькі пад навесам насупроць вакзала, у доўгім будынку цэйхгауза нешта час-ад-часу грукацела. Часамі ўскручвалася ў змроку польская лаянка і следам за гэтым упрашальны голас селяніна:

— Пане, дык-жа не пацягне конь! Што я вінаваты, пане!

— Маўчы, холера ценжка!

У змроку адбывалася спешная пагрузка на вазы ваеннага снаражання. Цяжка рыпелі колы ад доўгіх скрынак з вінтоўкамі, глуха пырхалі коні. Вунь з пляцформы саскочыў жаўнер і накіраваўся цераз пуць у памяшканне каменданта. Ён згледзеў адзінокую цень Віктара, накіраваўся быў да яго, потым перадумаў, і рушыў далей.

Як толькі ён схаваўся ў дзвярах, Віктар зараз-жа перайшоў пад другое дрэва, якое стаяла бліжэй да вадакачкі.

Цяпер яму самому трэба сцерагчыся больш, як бацьку. Ён ледзьве выратаваўся, калі выстраліў у капітана Марушэчка. Спярша, напалоханыя раптоўным стрэлам, палякі былі далёка ўцяклі ад Гарбатага маста. Але Марушэчак, нарэшце, спыніў іх і загадаў адкрыць агонь па кустах. Кулі пачалі абсякаць галінкі над галавою Віктара, зажугалі па вадзе. Ніхто з кустоў не адказваў. Тады палякі пачалі асцярожна набліжацца да кустоў. Некалькі коннікаў зноў прагрукацелі цераз гарбаты мост, каб заняць кусты з другога боку. Віктар тады, не выпускаючы з рук стрэльбы пачаў прадзірацца праз кусты ўніз па рэчцы. На гэтым баку кусты канчаліся. Тады ён размахнуўся берданкай і перакінуў яе на другі бок. Потым рынуўся ў халодную ваду сам. Паўз грэблю была пракапана доўгая шырокая канава. Пакуль палякі аббеглі яе, Віктар быў ужо ў лесе.

Дачакаўшыся, нарэшце, поезда з Менска, Віктар падышоў да дзвярэй у буфет і пачаў прыглядацца пры слабым святле да пасажыраў.

Важна, расцягваючы крок і пазваньваючы шпорамі, праходзілі паўз яго афіцэры ў чатырохкутніх пазнанскіх шапках, з белым арлом над казырком. Даўгія нікеляваныя палашы бразгалі па рэйках, цокалі па дробных каменьчыках перона. Паслужлівыя дзяншчыкі неўтрапёна ірвалі ў бок цяжкія дзверы буфета і, знямеўшы на некаторы момант, спрытна знікалі ў іх следам за начальствам.

Таропкім, дробненькім крокам прабягалі тоўстыя купчыкі ў чорных касцюмах. Няўважліва грукалі падкаванымі абсацамі падрадчыкі ў сваіх нязменных ватоўках з чортавай скуры. Пстрыкаў ля вагонаў электрычны ліхтарык і чуўся нейчы голас: «Матка боска, цо за галган. Свець ту, на рэйке». Нехта, спатыкнуўшыся ў поцемку, моцна вылаяўся, і дзве доўгія і худыя як тараны паненкі грэбліва зморшчылі губы ля Віктара. Адна сказала: «Які жах!» Другая, з конскім тварам, шыкнула: «То ест быдло». Прайшла, ведучы пад-ручку старую і адначасова паглядаючы млявым позіркам на шырокую бычыную шыю улана, маладзенькая дзяўчына ў канфедэратцы. Прашумеў шырокай зрэбнай расай высокі поп. Грукаючы гэблямі і адборнікамі ў мяшках, мінулі Віктара чатыры цесляры. Пачуўся булькатлівы свісток галоўнага кандуктара, яму абазваўся хрыпаты гудок паравоза і поезд рушыў.

Клаўдзя не прыехала.

«Пачакаю да заўтра»—вырашыў Віктар. Выйшаў праз дзверы агарожы на прывакзальны пляц і накіраваўся ў заездны дом. Гаспадыня прапанавала яму выпіць шклянку чаю, але ён адмовіўся і лёг на канапе, накрыўшыся жакеткай. Але заснуць не мог. Думкі пра бацьку не давалі яму спакою. Каб не белапалякі, дык хіба ён цягаўся-б так? Адзін! Ніхто цяпер не думае, дзе ён, ці пад'еў, ці добра ўсё з ім. І яму няма аб кім думаць. Пуста і холадна цяпер у яго душы... Клаўдзя? Але чаму яна не прыехала?

Што гэта за чалавек сядзіць за агульным сталом? Віктар толькі цяпер яго заўважыў. Ён з'явіўся ў часе адсутнасці Віктара. Можа прыехаў поездам? На яго тоўстым і круглым, як бульбіна, носе чорныя акуляры. Шчокі, румяныя як у дзяўчыны, выпучаны наперад. Рот вузкі з пухлявымі тоўстымі губамі. Чалавек п'е чай і моцна сапе, сам не заўважаючы гэтага. «Каб ён паслухаў сябе з боку, — падумаў Віктар, — то напэўна засароміўся-б». На стале стаяў самавар і высокая шкляная цукарніца з драбамі колатага цукру. Сапун еў сала з булкай і запіваў яго чаем.

На двары нехта коратка свіснуў і хутка ў калідоры пачуўся грукат крокаў. Гаспадыня высунулася з свайго пакою, дапытліва пазіраючы на ўваходныя дзверы і прытрымліваючы левай рукой напоўадкрытыя дзверы ў спальню. Зморшчаны твар яе бытаваў у вялікім напружанні, сіняватыя губы скамянелі. Толькі пасма сівых валасоў ледзь прыкметна ўздрыгвала ля вушэй: пад імі пульсавала цёмная жылка.

Яшчэ раз свіснулі (яшчэ больш коратка) у калідоры. Адчыніліся зашклёныя і завешаныя фіранкай дзверы і ў пакой сагнутай спіною наперад увайшоў чалавек (шэрае з хлясцікам паліто, чорныя штаны пад ім, чорны капялюш).

Твар жанчыны балюча ўздрыгануўся, нібы ад нейкага пакутлівага ўспаміну, калі чалавек выцягнуўшы з дзвярэй невялікі жоўты чамадан і вялікі клунак, павярнуўся тварам да прысутных і выпрастаўся.

— Здрафствуйце! — сказаў ён, убачыўшы гаспадыню.—Фот і я.

Вочы ў жанчыны зрабіліся круглымі ад нейкага жаху. Рука выпусціла дзверы і яны з грукатам зачыніліся.

— Як здароў, мадам? Гдзе мой комнат?

Жанчына, нарэшце, перамагла сваю нерухомасць.

— Добры дзень, мосье Пішэгру, — прамовіла яна дрыглівымі губамі. — Ідзіце ў гэты пакой.

— Харошо. Прабачце, мосье,—бліснуў ён на сапуна сваімі чорнымі глыбокімі вачамі, зачапіўшыся вялізным клункам за яго гладкую спіну.—Я нечайна

Сапун, які не паспеў праглынуць чарговай порцыі булкі з адрэзаным кавалачкам сала, здзіўлена пазіраў на незнаёмага.

Новапрыезджы і гаспадыня зніклі ў пакоі. Пішэгру, як назвала яго гаспадыня, балбатаў нібы сарока, смешна перакручваючы словы. Так цягнулася хвілін пяць. Нарэшце, гаспадыня выйшла, уся засмучаная, у агульны пакой і шчыльна зачыніла дзверы. Пішэгру нешта напяваў, то бразгаючы крэслам, то шуршачы паперай.

— Цётачка, хто гэта? — запытаўся сапун у гаспадыні. — Чаго вы ўздыхаеце?

— Няшчасце маё! Гэта — француз. Ён заехаў да нас у 1907 годзе і ў нас у той дзень быў пагром. Забілі майго мужа. Ён заязджаў у 1913 годзе і ў той дзень нейкі п'яны жандар спіхнуў майго сына, майго любага Якава, з поезда. Якаў нябожчык. Цяпер гэты француз зноў прывёз біду. Што мне рабіць? Як я магу не пусціць яго ў мой дом?

— Надзвычай цікава, — неяк у нос і працягла прамовіў чалавек у акулярах.

— Мадам, кофе! — гукнуў Пішэгру праз зачыненыя дзверы. І гаспадыня, як апантаная, рынулася на кухню.

Праз хвіліну Пішэгру скончыў парадкавацца ў сваім пакоі і выйшаў. Ён быў ужо ў камізэльцы, з сінім, у зялёныя палоскі наўскасяк гальштуку. Яго чорныя, як смоль, валасы, паблісквалі ад лямпы.

— Ну, фот. Пазнаёмімся, — сказаў ён, падаючы руку чалавеку ў акулярах.

— Гамулька. Вельмі рад, — хуценька выцершы пад сталом аб штаны засаленую руку, прагугнявіў чалавек у акулярах.

Француз сеў. Ён быў гаваркі і вельмі цікаўны. Ужо праз некалькі хвілін, Віктар, лежачы на канапе і пакутуючы ад бяссоння, даведаўся, хто яго суседзі, з іх размовы. Мосье Пішэгру быў прадстаўніком фірмы «Іспана-Сюіза» і прыехаў рабіць выбракоўку авіяцыйнага дрэва, закупленага ў пана Свянціцкага і суседніх памешчыкаў. У Расіі ён бываў і да рэвалюцыі ў якасці каміваяжэра. Ён усяляк расхвальваў французскія тавары і свой вялікі народ. Невядома, што гэта было, — камплімент ці шчырая пачцівасць, — але ён сказаў, што ў Расіі жыве таксама вялікі народ і што вайна Францыі з Расіяй у 1812 годзе — гэта прыкрая падзея.

Мосье Гамулька быў з Менска. Ён скончыў Варшаўскі універсітэт. Ён прыехаў праводзіць набор у армію. Ён член Беларускай Рады, — дадаў ён,— азіраючыся.

Порсткія чорныя вочы мосье Пішэгру здзіўлена зірнулі ў шэрыя бескаляровыя вочы Гамулькі.

— Я фас не разумею, мосье Гамулька. Вы служыце ў генеральным штабе князя Пілсудскага? Чаму ў фас штанкі касцюм?

— Я працую і ў роднай газеце «Звон». Пішу нарысы, фельетоны, апавяданні.

— Вы і пісьменнік?

— Шчыры беларускі пісьменнік, — прагугнявіў мосье Гамулька, і, мусіць, засароміўшыся высокакультурнага еўрапейца, адклаў у бок сала і пачаў піць чай з сухім хлебам.

Мосье Пішэгру нічога не разумеў.

— І палякі дазваляйт вам армію?

— Нават дапамагаюць. Вядома, не самастойную. Гэта ініцыятыва самога князя Пілсудскага.

— Прабачце, мосье Гамулька... Супроць каго ваявайт ваша армія?

І тут лопнула цярплівасць Гамулькі ад дзікай французскай неўцямлівасці. Ён завішчэў:

— Супроць большэвікоў. Палова беларускага краю яшчэ пад Советамі. Мы вызвалілі ад іх сталіцу нашай старонкі Менск.

Мосье Пішэгру блытаўся ўсё больш і больш.

— Пардон мосье Гамулька. У 1913 годзе я разумеў шыльды менскіх крам. Цяпер яны напісаны на ваш роднай мове?

— Амаль што. Польская мова мне бліжэй, чым руская.

— Значыць, дзяржаўнай мовай Беларусі абвешчана польская? У школах вучаць па-польску?

— Вучаць,—аблізваючы з губ рэшткі сала, адказаў мосье Гамулька.

Пішэгру дастаў партсігар, закурыў.

— Вот скажыце: народ як? Многа навербавалі ў армію?

— Народ яшчэ несвядомы, — уздыхнуў Гамулька. — Быў я ў адной воласці. Ніхто не хацеў ісці на сход, пакуль не даведаліся, што прыехаў чалавек і будзе гаварыць пра волю. Прышла тады ўся воласць. Заклікаў я людзей, каб ішлі запісвацца ў слаўнае войска. Тут і чалавек ваенны са мной быў...

Мосье Пішэгру нецярпліва зварухнуўся. Зварухнуўся на цвёрдай канапе і ўкрыты сялянскай жакеткай хлапец.

— Колькі запісалася?

— Ні адзін. Стаяць, як вады ў рот набраўшы, як сцяна глухая. Сорамна мне стала перад капітанам. Хоць у зямлю лезь. А яны стаяць, пазіраюць на цябе, як на д'ябла. Аж страшна мне зрабілася. Вядома, быдла цёмнае. Мужычко. Хіба гэта народ? Да смерці трэба бізунамі засекчы яго, тады хіба паразумнее!

Мосье Пішэгру здзіўлена разявіў рот. Прамармытаў па-французску:

— Першы раз сустракаю такога нягодніка! Прадаваць няшчасную бацькаўшчыну — гэта жах!

Мосье Гамулька ўстаў. У гэты момант адбылося нешта страшэннае. Тут мосье Пішэгру заблытаўся ўжо начыста.

Хлапец, які ў часе размовы нецярпліва варушыўся на канапе, раптам усхапіўся, нібы яго падняў выбух. Бліскаючы вачамі, поўнымі нянавісці, ён схапіў крэсла і кінуў ім з усёй сілы ў мосье Гамульку. Крэсла, разбіўшы і патушыўшы лямпу, грукнулася аб напоўнены абвіслы жывот члена Беларускай Рады. Потым у непраніклай цемры пачуўся напалоханы жывёльны крык мосье Гамулькі і цяжкія ўдары. Пішэгру ад жаху кінуўся ў свой пакой і замкнуў яго на ключ. Хутка крык мосье Гамулькі заціх. У пакой, несучы перад сабой дрыглівымі рукамі лямпу, увайшла згорбленая гаспадыня. Мосье Гамулька ляжаў выпрастаўшыся на падлозе. Хлапца не было.

— Я так і ведала, — прашаптала жанчына. — Пішэгру прывозіць у мой дом няшчасце. Бог мой, што мне рабіць? Што цяпер будзе?

У велізным нерухомым жываце беларускага міністра нешта булькала і хліпала. І гэта яшчэ больш наганяла жаху на старую жанчыну.

Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі

ГЕНІЯЛЬНЫ МАСТАК, ВЯЛІКІ ГРАМАДЗЯНІН

Памёр Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі. Гэтая вестка маланкаю абляцела ўвесь Савецкі Саюз і апаліла вострым болем нашы сэрцы. Памёр наш вялікі сучаснік, якім па праву ганарыцца краіна. Ушоў геніяльны мастак і геніяльны вучоны, які стварыў, выпеставаў лепшы ў свеце тэатр—МХАТ, выхаваў вялікую колькасць цудоўных майстроў сцэны, стварыў сістэму выхавання актора.

Даўгі і гераічны творчы шлях прайшоў Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі. Усё яго жыццё поўна беззаветным служэннем мастацтву, барацьбой за праўду мастацтва, супроць штампаў, халоднага рамесніцтва, пустога фармалізма. Цудоўны актор, непараўнальны рэжысёр, ён ніколі не здавальняўся дасягнутым. Ен пытліва ўглядаўся ў працэс творчасці, імкнучыся адшукаць і ўстанавіць тыя агульныя правілы, якія дапамогуць актору ствараць праўдзівыя і хвалюючыя вобразы, якія могуць выхаваць з кожнага здольнага артыста тонкага майстра рэалістычнага мастацтва. І ён устанавіў гэтыя правілы, да апошніх дзён жыцця ён вучыў моладзь, аддаваў усе сілы свайго генія на выхаванне новых майстроў сцэны нашай краіны.

«Сістэма Станіслаўскага»—гэта велізарная заваёва мастацтва праўды, незамянімы дапаможнік у стварэнні сацыялістычнага мастацтва. Да апошніх дзён ён удасканальваў сваю сістэму, адмаўляючыся ад памылковага, уносіў усё новыя і новыя вывады з свайго вялікага вопыта.

Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі нарадзіўся ў 1863 годзе, «на рубяжы двух эпох», як піша ён у сваёй кніжцы «Мае жыццё ў мастацтве». Любоў да тэатра з самых дзіцячых год захапляе Канстанціна Сяргеевіча і ўсё жыццё ён прысвячае любімаму мастацтву, не шкадуючы для яго нічога. Ен іграе ў аматарскіх гуртках, вучыцца ў вялікіх майстроў сцэны, заснОўвае у 1888 годзе (разам з Федотавым і Камісаржэўскім) «Таварыства аматараў літаратуры і мастацтва». Тут ужо раскрываецца вялікі акторскі і рэжысёрскі талент Канстанціна Сяргеевіча. У 1898 годзе К. С. Станіслаўскі і В. І. Неміровіч—Данчанка заснОўваюць «Маскоўскі агульнадаступны мастацкі тэатр». Яны добра адчувалі, што патрэбны новы тэатр, пабудаваны на зусім іншых прынцыпах, чым стары тэатр—патрэбны тэатр творча мэтаімкнёнага калектыва, тэатр передавой грамадскай думкі, тэатр новых сцэнічных форм, вызваленых ад штампаў, дурных трафарэтаў і рамесніцтва старога тэатра. Прадоўжваючы шчэпкінскія традыцыі, Станіслаўскі і яго тэатр узнялі рускае тэатральнае мастацтва на небывалую вышыню, зрабілі яго лепшым на свеце.

Саракагодняя гісторыя МХАТ'а—гэта сорак год геніяльнай нястомнай творчасці К. С. Станіслаўскага, яго няўхільныя пошукі ўсё новых і новых шляхоў для стварэння праўды на сцэне. Больш 50 спектакляў паставіў Канстанцін Сяргеевіч на сцэне МХАТ'а; з іх больш 20 пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Станіслаўскі не задавальняўся адным тэатрам—ён арганізоўваў студыі, працаваў з моладдзю, чутка адгукаўся на ўсе новыя веянні часу. Але ніколі Станіслаўскі не збіваўся са шляху рэалістычнага, праўдзівага, жыццёвага мастацтва.

З запалам вялікага мастака і нязломнага барацьбіта ён адстойваў і адстаяў прынцыпы тэатральнага рэалізма ад усіх і ўсякіх фармалістычных эпігонаў. Пасля Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі Канстанцін Сяргеевіч з надзвычайным энтузіязмам паставіў сваё мастацтва на службу рэвалюцыйнаму працоўнаму народу.

Надзвычайнай павагаю і любоўю карыстаецца ў нашага народа авеяны сусветнай славай тэатр і яго аснавапачынальнік і кіраўнік двойчы ордэнаносны народны артыст СССР Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі. Да апошніх дзён жыцця К. С. Станіслаўскі вёў вялікую творчую работу над «Тарцюфам» Мальера ў МХАЦе, над савецкай операй «Пагранічнікі» Сцепанава ў оперным тэатры яго імені, над выхаваннем новай студыі.

Тэатр Станіслаўскага асвятляў шлях усім мастакам сцэны ў авалоданні мастацтвам праўды. Уплыў, які аказаў МХАТ і асабіста К. С. Станіслаўскі на рост рэалістычнага майстэрства нашага савецкага тэатра—надзвычайны. Ен быў тым маяком, які сапраўднаму мастаку паказваў на ўсю спустошанасць фармалістычнага мастацтва. Надзвычайная роля вучэння і практыка К. С. Станіслаўскага ў росце нацыянальных культур Савецкага Саюза, у прыватнасці, нашага беларускага савецкага тэатральнага мастацтва. У Станіслаўскага нашы лепшыя работнікі тэатра вучыліся мастацтву праўды.

Само жыццё К. С. Станіслаўскага — узор да пераймання для кожнага савецкага мастака. Трэба вучыцца так, як Канстанцін Сяргеевіч, аддаваць усе свае сілы мастацтву чэсна і бескарысліва. Трэба вучыцца няўтомнай працаздольнасці, упартасці ў дасягненні мэты, высокай самакрытычнасці ў вялікага актора, рэжысёра, педагога. Канстанцін Сяргеевіч ненавідзеў тых, хто «пачынае праследваць не асноўную, агульную, а асабістую, прыватную мэту, якую ён любіць больш, чым самую калектыўную творчасць. Тут смерць мастацтву, і трэба спыняць размовы аб ім».

Крышталь чысты, поўны абаяння і чаруючай сілы вобраз найвялікшага майстра ў мастацтве Канстанціна Сяргеевіча, усе створаныя ім вобразы і спектаклі, напісаныя ім кнігі, яго сістэма,—усё гэта мы захаваем для патомства.

Памяць аб ім і яго вучэнне будуць упісаны ў гісторыю сацыялістычнага мастацтва залатымі літарамі.

Светлы вобраз Канстанціна Сяргеевіча будзе клікаць нас, работнікаў мастацтва і літаратуры краіны сацыялізма, няўтомна, чэсна працаваць над стварэннем вялікага мастацтва сацыялізма.

ЯГО ІМЯ—ЦЭЛАЯ ЭПОХА ДЛЯ СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

Совецкія кампазітары БССР глыбока смуткуюць з прычыны страты велізарнага мастака, генія тэатра Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага. Яго імя — цэлая эпоха для совецкага мастацтва, асабліва ярка расквітнеўшага пасля Вялікага Кастрычніка. Для нас, кампазітараў, Канстанцін Сяргеевіч дарагі і блізкі яшчэ і сваёй выключнай усебаковасцю, геніяльным пранікненнем, якія ён праявіў у галіне музыкі, у галіне опернага мастацтва.

Смерць Канстанціна Сяргеевіча—вялікая страта для мастацтва нашай краіны. Але імя Станіслаўскага жыве і будзе жыць у сэрцы кожнага творчага работніка, ён заўсёды будзе прыкладам любві, глыбіні разумення, упартай працы і заўсёды маладых, невгасаючых імкненняў да вяршынь мастацтва.

Дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР БАГАТЫРОЎ і ТУРАНКОЎ. Кампазітары: АЛАДАЎ, ЦІКОЦКІ, ШЧЭГЛОЎ, КРОШНЕР, ЧУРКІН, ПАДКАВЫРАЎ, ІВАНОЎ, РАВЕНСКІ, ЛУКАС.

Вялікая страта

Сорак год позіркі ўсіх працоўных і работнікаў мастацтва ўсіх краін былі накіраваны да Мастацкага тэатра, створанага і кіруемага геніяльным майстрам сцэны Канстанцінам Сяргеевічам Станіслаўскім. Яшчэ ярчэй зазяў велізарны талент Канстанціна Сяргеевіча пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая вызваліла мастацтва і стварыла ўсе ўмовы для буйнага росквіту ўсіх духоўных сіл чалавека.

Совецкая грамадскасць заўсёды горача падтрымлівала творчую думку вялікага мастака, заўсёды бурна радавалася яго поспехам. І не хочацца верыць, што гэтага майстра совецкага тэатра—майстра з майстроў—ужо няма сярод нас.

Пісьменнікі Совецкай Беларусі, разам з усімі працоўнымі СССР, глыбока смуткуюць аб гэтай вялікай страце.

Янка КУПАЛА, Якуб КОЛАС, Міхась ЛЫНЬКОЎ, З. БЯДУЛЯ, Кузьма ЧОРНЫ, Кандрат КРАПІВА, З. АКСЕЛЬРОД, М. КЛІМКОВІЧ, Пятрусь БРОЎКА, Пятро ГЛЕБКА, Эд. САМУЙЛЕНАК, М. ІЛЬІНСКІ, Г. КАМЯНЕЦКІ.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці геніяльнага мастака, майстра сцэны, стваральніка лепшага ў свеце Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра (МХАТ) народнага артыста СССР, ордэнаносца КАНСТАНЦІНА СЯРГЕЕВІЧА СТАНІСЛАЎСКАГА і выражае сваё шчырае спачуванне сям'і нябожчыка і калектыву МХАТ.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР.



НАРОДНЫ МАСТАК БУДЗЕ ЖЫЦЬ

Думка аб смерці генія тэатра вялікага рускага народа, велічнага чалавека, чыё значэнне шмат шырэй значэння нават геніяльнага рэжысёра і актора, думка аб смерці найвялікшага майстра совецкага мастацтва—гэта думка аб смерці Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага прыносіць вялікі боль. Час ужо, здаецца, «прымірыцца» з непазбежнасцю смерці. Але калі яна забірае назаўсёды такіх людзей-колясаў, такіх вельмі патрэбных і дарагіх усім нам настаўнікаў,—усё ў цябе абураецца і не хочацца верыць і яшчэ менш можаш «мірыцца» з жудасным фактам.

Памёр геніяльны выхавацель плеяды талентаў совецкага тэатра, майстар, наватар, тварэц геніяльнай «сістэмы» і МХАТ'а. Я імкнуся ўспомніць яго ў жыцці, на сцэне, усё, што чытаў і ведаю аб ім, я адчуваю, што гэта мне жыццёва неабходна, я вельмі баюся ці не забыў чаго важнага аб Канстанціну Сяргеевічу, аб яго цудоўным жыцці і рабоце, бо ведаю, што забытае абедніць мяне, маё жыццё і маё мастацтва. І першае маё пачуццё, пасля здрантвення ад сумнай весткі, гэта адчуванне жывога Станіслаўскага і імкненне яго—жывога—назаўсёды захаваць у сябе і каля сябе.

Гэта лёгка—бо так яркі і па асабліваму жывы быў Станіслаўскі; яго можна было адчуваць на адлегласці, ён свяціў далёка.

І гэта так цяжка, бо, як само жыццё—складана і шматвобразна была гэта з'ява,—якому імя Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі.

Колькі ні напісана кніг, артыкулаў і т. д. аб Канстанціну Сяргеевічу, колькі разоў не спрабавалі апісаць, ахарактарызаваць, прааналізаваць аблічча і работу гэтай цудоўнай з'явы ў чалавецтву,—усё напісанае ёсць толькі іскра ў параўнанні з сонцам.

Як цяжка ўлавіць жывую пульсацыю сапраўднага жыцця, як цяжка перадаць няўлоўныя пераходы колераў усходу і захаду сонца, як цяжка пераклясці на ноты гучашчы лес, стэп, мора, буран, як цяжка запісаць у цябе самым псіхічныя працэсы, эмацыянальныя пераходы, як цяжка напісаць у другі раз «Джыоконду», 2-ю і 9-ю сімфоніі,—так цяжка ўлавіць і выкласці словамі вобраз гэтага непараўнанага мастака і чалавека, злітых у адно, і ўсяго вялікага, што ён зрабіў. Але як гэта не цяжка,—неабходна зрабіць у асобку і калектыўна. Ні адно слова Канстанціна Сяргеевіча не павінна быць забыта, ні адна заўвага, ні адна думка не пакінуты без патрэбнай увагі, ні адзін факт жыцця і работы не прапушчаны, ні адна роля не забыта, ні адзін спектакль не пакінуты без глыбокага аналіза. Агульнымі намаганнямі мы павінны аднавіць і захаваць мастацтва тэатра, якое ён рабіў, перамагаўшы праклятую афемернасць нашага мастацтва тэатра, амаль недаступнага фіксацыі.

Яго спадчына велізарна, яна яшчэ не сабрана, не ацэнена дастаткова. А між тым у ёй—вялікія крыніцы харчавання, якія доўга, доўга, быць можа, ніколі не вычэрпнуцца.

Сваю тэатральную вучобу я пачаў у вучняў Канстанціна Сяргеевіча, а потым, захапіўшыся фармалістычным мастацтвам Мейерхольда, Таірава і інш., пачаў заходзіць у тупік антырэалістычнага мастацтва. Артыкулы «Праўды», крытыка таварышоў накіравалі маю ўвагу на памылкі майго шляху, і канчатковы зварот мой да рэалістычнага тэатра дапамог мне зрабіць МХАТ, работы Канстанціна Сяргеевіча, яго кніга, выказванні, і ў маёй душы будзе заўсёды жыць вобраз гэтага «прыгажуна-чалавека», вобраз бясконца блізкі і дарагі.

У цяжкія для мастака хвіліны я звяртаюся да яго, да яго спектакляў, да яго тэатра, яго слоў, да слоў яго лепшых вучняў і знаходжу ў іх дапамогу, падтрыманне ў цяжкай, і ганаровай маёй рабоце совецкага рэжысёра, дапамогу маральную, тэхналагічную, метадалагічную і ўсякую іншую патрэбную і каштоўную дапамогу. І таму я так хочу мець усё аб ім, усё ім сказанае—гэта вялікая крыніца думак, гэта вялікі і натхняючы прыклад — Станіслаўскі — жывы, ён быў пры жыцці жывей за многіх жывых, ён жывы і пасля смерці.

Такія не паміраюць.

Ен будзе заўсёды вучыць быць сапраўдна совецкім, народным мастаком і рабіць рэчы, вартыя эпохі вялікага Сталіна, як сам рабіў апошнія гады сваёй светлай памяці жыцця.

ЛЕЎ ЛІТВІНАЎ,
заслуж. арт. БССР.

МАСТАК-ЗМАГАР

Памёр вялікі сын вялікага рускага народа, геніяльны мастак сцэны, аснавальнік МХАТ, асновапаложнік усяго лепшага, усяго высокага і простага, усяго самага праўдзівага і яркага, усяго самага прагрэсіўнага, што ёсць у совецкім тэатральным мастацтве — перадавым мастацтве свету, — памёр Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі.

Яго імя стала сімвалам мастака-змагара, які аддае ўсе свае сілы, усе свае замыслы свайму народу, сімвалам мастака, які бесперапынна ўпарта імкнецца наперад, ставіць перад сабой велізарныя задачы і з непахіснай упартасцю перамагае ўсе труднасці на сваім шляху, тварца, грамадзяніна, барацьбіта, за росквіт мастацтва свайго вялікага народа.

Любоў да свайго народа была сапраўднай крыніцай натхнення, яна жывіла яго геніяльнасць, яго невычарпальныя творчыя сілы.

І невыпадкова цяпер-жа, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, ён звязаў свой лёс з лёсам совецкага мастацтва і аддаў усе свае творчыя сілы мастацтву сацыялізма. Бо сацыялізм стварыў удзячную глебу для развіцця сапраўднага мастацтва—праўдзівага і аптымістычнага.

Мастацтву сацыялізма ён пакінуў аграмадную спадчыну — стройную сістэму і цэлую плеяду вартых вучняў і паслядоўнікаў, якія сваімі маладымі сіламі і ўпартасцю будуць прадоўжваць вялікую справу геніяльнага Станіслаўскага.

Калектыў Віцебскага беларускага дзяржаўнага тэатра разам з усімі работнікамі мастацтва, разам з усім совецкім народам, смуткуе аб цяжкай страце. Вялікія ідэі Станіслаўскага, пранікли ва ўсе тэатры Совецкага Саюза, пранікли і ў наш тэатр, і мы, разам з усімі работнікамі мастацтва, усё жыццё прысвяцім таму, каб гэтыя ідэі ўвасобіць у жыццё, каб на іх аснове ствараць спектаклі, поўныя жыццёвай праўды, прасякнутыя духам бальшэвізма, высокія па сваёй ідэйна-мастацкай якасці. Гэта будзе лепшым помнікам вялікаму Станіслаўскаму.

КАЛЕКТЫЎ ВІЦЕБСКАГА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА.

Нястомны наватар

Совецкае мастацтва панесла цяжкую страту. Памёр буйнейшы майстар нашай сцэны, народны артыст Саюза ССР Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі. У яго асобе мы страцілі велізарнага майстра-актора, рэжысёра і педагога. Ен быў настаўнікам некалькіх пакаленняў актораў, рэжысёраў і драматургаў. Усё сваё жыццё ён быў змагаром за сапраўдны рэалізм у мастацтве, за насычэнне спектакля ідэйна-палітычным зместам, за спектакль, які выхоўвае гледача. Ен быў сапраўдным «інжынерам чалавечых душ».

Пачаўшы свой шлях «аматарам драматычнага мастацтва» і дайшоўшы да вышынь майстэрства, ён усё сваё жыццё змагаўся супроць «аматарства» з аднаго боку і рамесленнага майстэрства—дрэннага прафесіяналізма—з другога. Барацьбу гэту ён вёў у імя праўды жыцця ў мастацтве, у імя сапраўднага рэалізма, ідэйнай глыбіны.

Прыкланяючыся перад лепшымі традыцыямі Шчэпкінскага рэалізма ў пачатку сваёй творчай дзейнасці, ён імкнуўся знайсці ключ да іх, падвесці пад іх цвёрдую базу, увасобіць іх у сістэму. З'яўляючыся прадаўжальнікам рэалістычнага шляху рускага тэатра, ён з раскіданых і выпадковых думак, нататак і жывых традыцый стварае сваю славутую сістэму, якая ляжыць цяпер у аснове выхавання совецкага актора.

Ен змагаецца за яе ва ўмовах буржуазнага тэатра, спачатку выклікаючы сумненне нават у бліжэйшых сваіх саратнікаў; яму прыходзіцца абараняць яе ад нападак прыхільнікаў старога «традыцыйнага», у горшым сэнсе гэтага слова, тэатра і ад нападак новага буржуазна-эстэтычнага «мадэрнісцкага» тэатра. І толькі ў нашу вялікую сталінскую эпоху сістэма Станіслаўскага становіцца здабыткам усяго совецкага сцэнічнага мастацтва.

Як і жыццё самога Канстанціна Сяргеевіча, так і сістэма яго—дыялектычна. Яна не адліваецца ў закончаную жорсткую догму, але маючы сваёй мэтай вышэйшую мастацкую праўду — праўду жыцця, яна ўвесь час жыве, развіваецца, прыстасоўваючыся да змен самога жыцця і да індывідуальнасці вывучаючых яе.

З моманту ўзнікнення сістэмы і да канца дзён сваіх Канстанцін Сяргеевіч няўтомна шукаў новых метадаў, новых шляхоў, не спыняючыся на знойдзеным высокім майстэрстве, і няўхільна імкнуўся да вяршынь рэалістычнага мастацтва. І ў галіне рэжысуры ён з'яўляўся такім-жа шукальнікам і стваральнікам. Яго метады работы над п'есай, раскрыццё ім ідэйна-палітычнай глыбіні спектакля непасрэдна звязаны з драматургіяй нашых вялікіх рэалістаў Чэхава і Горкага.

Сам Канстанцін Сяргеевіч адзначае, што на яго зрабіў вялікі ўплыў М. Горкі, які ўнёс у яго творчасць грамадска-палітычны змест, які і лёг у аснову яго рэжысёрскай работы. Падыход Станіслаўскага-рэжысёра да п'есы, яго работа над ёю, стварэнне ім рэжысёрскай партытуры прадстаўляюць сабою такое-ж вышэйшае дасягненне рэжысёрскага майстэрства, як і непарыўна звязаная з ім яго сістэма акторскага майстэрства. У працэсе іх стварэння і развіцця Канстанцін Сяргеевіч нястомна выхоўвае пакаленне за пакаленнем актораў, рэжысёраў і драматургаў. І апрача непасрэдна выхаваных ім ці яго вучнямі няма ў нашым Саюзе ні аднаго работніка тэатра, якога так ці інакш не закранулі сістэма і творчы шлях Канстанціна Сяргеевіча.

Усе, каму прыходзілася сутыкацца з ім у сваёй творчай дзейнасці, ніколі не забудуць яго вобраза, вобраза чалавека-тварца, які ўсё сваё жыццё аддаў рэалістычнаму мастацтву.

Ен памёр, выконваючы ўскладзеную на яго партыяй і ўрадам высокую місію выхавання самых таленавітых прадстаўнікоў нашага маладога пакалення, якія павінны яго сістэму, яго метады, яго творчае гарэнне замацаваць, як заваёвы нашай сацыялістычнай радзімы.

Яго жыццё—жыццё найвялікшага рэаліста рускага тэатра, які змагаўся за праўду жыцця ў мастацтве; яго сістэма—найвялікшае дасягненне акторскага майстэрства; яго творчасць, як рэжысёра, назаўсёды ўвойдзе ў залаты фонд совецкага мастацтва.

Д. РУМЯНЦАЎ.

Абяцаем захоўваць яго геніяльныя заветы

Калектыў Беларускага тэатра оперы і балета ўсхвалёван весткай аб смерці любімага настаўніка сцэнічнага мастацтва Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага і выражае яго саратнікам і выхаванцам свой глыбокі жаль, раздзяляючы з імі смутак аб яго страце. Абяцаем шанаваць яго памяць і захоўваць яго геніяльныя заветы. Цясней згуртуем нашы рады, глыбей авалодаем яго сістэмай і створым творы, вартыя вялікай сталінскай эпохі.

Калектыў работнікаў Тэатра оперы і балета.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БССР НА ПАХАВАННЕ К. С. СТАНІСЛАЎСКАГА

8 жніўня з Менска ў Маскву для ўдзелу ў пахаванні Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага выехала дэлегацыя работнікаў мастацтва БССР. У склад дэлегацыі ўвайшлі тт. Малькова, Александроўская (Тэатр оперы і балета), Кашэльнікава (Віцебскі драмтэатр), Е. Рамановіч (Белдзяржрамтэатр), Трэпель (Дзяржаўны яўрэйскі тэатр), Кабішчар (цырк), Бары (Філармонія).

Дэлегацыя ўскладзе на магілу К. С. Станіслаўскага вянок з надпісам: **«Вялікаму майстру і мастаку К. С. Станіслаўскаму ад работнікаў мастацтва БССР».**

ЯРКАЕ ЖЫЦЦЁ

Калектыў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра глыбока ўсхваляваны смерцю геніяльнага мастака вялікага рускага народа, найвялікшага майстра совецкай сцэны, народнага артыста СССР ордэнаносца Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага.

Разам з шматнацыянальным народам Совецкага Саюза, разам са слаўным калектывам МХАТаўцаў і бліжэйшымі саратнікамі нябожчыка, разам з усімі тэатральнымі калектывамі народаў вялікага Совецкага Саюза, шчыра смуткуем аб смерці вялікага выхавацеля, найглыбейшага артыста і рэжысёра, геніяльнага, нястомнага змагара за сацыялістычны рэалізм совецкага тэатра.

Жыццё і дзейнасць Канстанціна Сяргеевіча натхняе нас, совецкіх мастакоў, на стварэнне твораў мастацтва, вартых эпохі вялікага Сталіна.

КАЛЕКТЫЎ БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТРА.

БЫВАЙ, ДАРАГІ НАСТАЎНІК!

З вялікім душэўным болем выслухалі мы сумную вестку аб смерці геніяльнага майстра рэалістычнага тэатра, стваральніка сістэмы выхавання актора, кіраўніка і натхніцеля маскоўскага Мастацкага тэатра, народнага артыста СССР, ордэнаносца Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага.

Для нас, маладых актораў, якія імкнуцца да авалодвання майстэрствам рэалістычнага мастацтва, імя Канстанціна Сяргеевіча будзе тым путэводным маяком, што ўказвае шлях да дасягнення гэтай мэты.

Балюча ўсведамляць, што вялікага настаўніка няма сярод нас, што нам не прыйдзецца ніколі слухаць яго цёплае, мудрае слова. Але ўсё дасягнутае і знойдзенае геніяльным майстрам сцэны захоўваюць для нас яго вучні, яго працы, па іх мы будзем вучыцца авалодваць вяршынямі сапраўднага майстэрства.

Светлы вобраз геніяльнага мастака — надзвычайнага сына сваёй радзімы, — увесь яго жыццёвы шлях, поўны гераічнага, пытлівага, творчага розуму, упартасці ў дасягненні мэты, велізарнай самакрытычнасці да самога сябе і да сваіх вучняў — узор для ўсіх нас, як неабходна жыць і працаваць на карысць сваёй радзімы, аддаючы ўсе свае сілы будаўніцтву сацыялістычнага мастацтва.

Мы ніколі не забудзем імя Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага. Усё зробленае ім для росту нашага мастацтва ўвойдзе ў гісторыю совецкага тэатра адною з самых яркіх яе старонак.

Бывай, дарагі настаўнік!

Бывай, незабыўны Канстанцін Сяргеевіч!

Калектыў работнікаў Дзяржаўнага тэатра юнага гледача БССР.

ГЛЫБОКІ ЖАЛЬ

Калектыў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР выражае свой глыбокі жаль з прычыны смерці геніяльнага майстра сцэнічнага мастацтва, аснавальніка мастацкага тэатра, тварца лепшай на свеце сістэмы акторскага майстэрства, — народнага артыста СССР, ордэнаносца Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага і выражае сваё глыбокае спачуванне сям'і нябожчыка.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР.

ЛІКВІДАВАЦЬ ВЫНІКІ ШКОДНІЦТВА Ў ІНСТЫТУЦЕ ЛІТАРАТУРЫ І МОВЫ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР

Тыдні два таму назад Прэзідыум Акадэміі навук БССР заслухаў паведамленне вучонага сакратара Інстытута літаратуры і мовы тав. К. Гурскага аб рабоце інстытута. Паведамленне было вельмі трывожным. Тым не менш прэзідыум абмежаваўся некалькімі прыяцельскімі парадамі і абяцаў распрацаваць неабходныя канкрэтныя рашэнні. Нажаль, рашэнняў гэтых да гэтага часу няма. Такім чынам, у бліжэйшы час не прадбачыцца і тых канкрэтных мерапрыемстваў, якія павінны быць ажыццёўлены для аздараўлення інстытута.

На працягу доўгага часу ў кіраўніцтве інстытута і яго секцыях арудавалі махровыя ворагі народа. Шкодніцтва ўжывалася ў шырокіх маштабах. Не выконваліся і зрываліся важнейшыя заданні партыі і ўрада. Планы работы інстытута сістэматычна засмечваліся нікому непатрэбнымі тэмамі ці такімі тэмамі, якія ішлі ўразрэз з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва. Выкананне тэматыкі, патрэбнай для росту нашай соцыялістычнай культуры, для больш паспяховай работы навучальных устаноў, для ўздыму народнай гаспадаркі на больш высокую ступень, — шкоднікамі сабатавалася, запягвалася ці зусім зрывалася.

Каля дзесяці год пісалі ў інстытуце гісторыю беларускай літаратуры, вельмі патрэбную нашай моладзі, нашым вузаўцам, нашай працоўнай інтэлігенцыі. З года ў год гэта тэма пад рознымі назвамі ўпрыгожвала гадавыя планы работы інстытута, але... справа не рухалася з месца. У плане 1937 года гэтая тэма фігурыруе пад назвай «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры». У плане 1938 года «Нарысы» ператварыліся ў падручнік па гісторыі беларускай літаратуры. Але складанне падручніка толькі пачата, канца гэтай работы яшчэ не відаць і хто ведае, колькі змен гэта тэма яшчэ перацерпіць.

Каля чатырох год марынуецца руска-беларускі слоўнік, якога нецярпліва чакаюць сотні тысяч школьнікаў, студэнтаў, калгаснікаў, рабочых. Гэтаму слоўніку, як і многім іншым работам інстытута, «не пашанцавала». Згодна плана, слоўнік павінен быў быць адрэдагаваны галоўнай рэдакцыяй у канцы 1937 года. За ўвесь год работа не пасунулася ні на крок, бо даручылі яе выкрытаму потым ворагу народа. У бягучым годзе была створана новая рэдакцыя, але на чале яе зноў аказаўся вораг народа. Зараз стаіць пытанне аб трэцяй рэдакцыі.

Арфаграфічны слоўнік, які павінен быў быць закончан у 1937 годзе, затрыман у сувязі з пастаноўкай пытання аб новым правапісе. Год работы прайшоў дарэмна.

Два гады працаваў праф. Ломцеў над сінтаксісам беларускай мовы, але нічога не вышла.

Такіх фактаў, калі людзі працавалі ўпустую, можна прывесці яшчэ вельмі многа.

Ворагі народа не толькі зрывалі планы інстытута, але займаліся актамі дыверсіі. Ці-ж гэта не дыверсійны акт — скажэнне беларускага правапіса, засмечанне беларускай мовы паланізмамі, перагрузка тэматычнага плана інстытута нікому непатрэбнымі «акадэмічнымі» выданнямі і т. д.?

У інстытуце доўгі час панаваў культывіруемы ворагамі народа развал працоўнай дысцыпліны, штучна распальваліся беспрынцыпныя склокі. Была створана абстаноўка бяздзелля, раўнадушнасці. Здольная совецкая моладзь зацiралася, яе ігнарыравалі. Каб пагутарыць з «начальствам», сяму-таму маладому навуковаму работніку даводзілася тыднямі збіваць парогі прыёмнай.

Зараз перад кіраўніцтвам Інстытута літаратуры і мовы і прэзідыумам Акадэміі навук БССР стаіць вялікая адказная задача — хутка і рашуча ліквідаваць вынікі шкодніцтва, стварыць усе ўмовы для стопрацэнтнага выканання баявых заданняў партыі і ўрада.

У план работы інстытута на 1938 год уключана мінімум таго, што інстытут можа зрабіць. План зусім рэальны. Трэба толькі ў першую чаргу закончыць з атмасферай бяздзелля, якая яшчэ вельмі адчуваецца ў інстытуце.

Асноўная тэма гэтага плана — складанне падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Работа пасоўваецца вельмі марудна і напісана толькі на процантаў дваццаць. Тэрмін складання падручніка — 1 студзеня 1939 года. І трэба прыняць усе меры, каб работа была здадзена своечасова.

Між іншым, праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР абавязалася забяспечыць удзел у гэтай рабоце крытыкаў і пісьменнікаў, але апрача таварышоў К. Чорнага і М. Клімковіча ніхто з крытыкаў і пісьменнікаў не спяшаецца даць сваю згоду на аказанне інстытуту неабходнай дапамогі.

Другая тэма — складанне падручніка па сінтаксісу беларускай мовы. Была створана брыгада, якая падручнік напісала. Зараз ён пасланы для рэцэнзіі. Здача падручніка ў друк мяркуецца ў кастрычніку. Гэты тэрмін не павінен быць сарваны.

Трэцяя тэма — выданне яўрэйска-рускага слоўніка. Слоўнік складзен, прайшоў рэцэнзаванне, але стаіць пытанне аб складзе галоўнай рэдакцыі. Пытанне павінна быць вырашана як можна хутчэй. Павінна быць таксама тэрмінова вырашана пытанне аб складзе рэдакцыі руска-беларускага слоўніка.

У парадку дня — пытанні аб беларускім правапісе, аб складанні картатэкі беларуска-рускага слоўніка і інш.

З усімі гэтымі работамі інстытуту няцяжка справіцца. Інстытут не кепска ўкамплектаваны работнікамі. Паводле штата нехапае толькі прафесара па мове і... дырэктара.

Два месяцы таму назад пры інстытуце створан вучоны совет. Нажаль, некаторыя члены совета нават не з'яўляюцца на паседжанні.

Трэба даць інстытуту кіраўніка, трэба ажывіць работу вучонага совета, вызваліўшы яго ад «ганаровых» членаў, не жадаючых прымаць удзел у вырашэнні задач, якія стаяць перад Інстытутам літаратуры і мовы.

А задачы інстытута надзвычай адказныя. Асноўная з іх — як можна хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва на фронце літаратуры і мовы, стварыць новыя каштоўнасці ў гэтай галіне, якія яшчэ больш узбагацяць соцыялістычную культуру беларускага народа.

Прэзідыуму Акадэміі навук трэба сур'ёзна, па-бальшэвіцку заняцца Інстытутам літаратуры і мовы.

І. П.

„У ПУШЧАХ ПАЛЕССЯ“

У РАГАЧОЎСКІМ КАЛГАСНЫМ ТЭАТРЫ

Рагачоўскі калгасны тэатр паказаў свайму гледачу драму народнага паэта БССР Я. Коласа «У пушчах Палесся» паводле ўсім вядомай аповесці аўтара «Дрыгва».

Як і ў аповесці, у драме адлюстроўваецца гераічная барацьба партызан і Чырвонай Арміі з белапольскімі бандамі ў часы белапольскай акупацыі Беларусі.

Роля комуністычнай партыі ў арганізацыі сялянскай беднаты і партызанскіх атрадаў на барацьбу з белапольскімі акупантамі паказана ў вобразе Жыбуля, бальшэвіка - падпольшчыка. Вобраз Жыбуля ў п'есе паказан больш выпукла і ярка, чым вобраз Невідняга ў аповесці.

Гэта, безумоўна, з'яўляецца станоўчым у драме. Народны паэт рэспублікі Я. Колас багата насыціў сваю п'есу народнымі прыказкамі, трапнымі выразамі народнай мудрасці, што надае твору роднасць і рэальнасць.

Значыць, калгасны тэатр узяўся за ўдзячную справу, паставіўшы сіламі свайго калектыва гэтую п'есу.

Пастаноўка гэтага спектакля сведчыць, што некаторыя акторы значна папрацавалі над ролямі, сур'ёзна аднесліся да сваёй справы.

Галоўны вобраз—дзеда Талаша, кіраўніка партызанскага атрада, вельмі добра выкананы артыстам Свірчэўскім. Тав. Свірчэўскі здолеў паказаць забітага, прыгнечанага селяніна - бедняка Палесся, які ў часы грамадзянскай вайны разам са сваім братам па класу—рабочым, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, вёў барацьбу з інтэрвентамі, унутранай і знешняй контррэволюцыяй. Дзед Талаш—змагар за шчаслівае жыццё беларускага народа, любімы герой наш, гледачом быў сустрэт надзвычай цёпла.

Таксама трэба адзначыць добрую ігру артыста Гаробчанкі ў выкананні ролі Саўкі Мільгуна. Саўка Мільгун, вясковы злодзей — канакрад, народжаны ўмовамі соцыяльнага распластавання дарэволюцыйнай вёскі, перагвараецца ў ворага працоўных, шпіёна польскай разведкі. Гэта праўдзіва, тыпова і досыць жыва выражана ў ігры тав. Гаробчанкі.

Невялікая, амаль другарадная роля Дарвідошкі ў п'есе, даволі жыва пададзена выканаўцам яе, артыстам Талпега. Артыст Талпега здолеў паказаць вобраз панскага парабка, забітага, прыгнечанага, які, натуральна, у працэсе жорсткай класавай барацьбы становіцца на бок партызан, робіцца ядрэнным партызанам. Гэта пераканаўча артысту ўдалося паказаць. Толькі, нам здаецца, што тав. Талпега нехапіла пачуцця меры і неабходнай стрыманасці ў раскрыцці гэтага вобраза.

Ролі Мартына Рыля (арт. Каваль), Бусыгі (арт. Бараноўскі), Жыбуля (арт. Савіч), Букрэя (арт. Васілеўскі), Петраша (арт. Галанцоў) таксама выкананы з пэўнымі станоўчымі якасцямі ў ігры кожнага артыста, але менш тыпова і выразна, чым папярэднія ролі, указаныя вышэй. Праўда, з гэтых пералічаных ролей больш ярка выканана роля Бусыгі. Асобныя месцы ў ігры артыста Бараноўскага захапляючыя (напрыклад, нямая сцэна, калі Бусыга кашачай ступой крадзецца туды, куды пайшлі дзед Талаш і Мартын Рыль).

Самым слабым месцам ва ўсім спектаклі трэба лічыць выкананне ролі Аўгінні артысткай Дуброўскай. Артыстка Дуброўская іграе вельмі вяла, не адчуваецца па сутнасці ігры пачуццяў, рухаў, мімікі. Вобраз Аўгінні ў п'есе аўтарам раскрыт больш глыбока, чым у аповесці, і гэта ў першую чаргу патрэбна было ўлічыць тав. Дуброўскай, каб паказаць гледачу вобраз сялянкі з моцнай воляй і вялікай пачуццёвасцю. Больш страснасці, унутранага хвалявання ў ігры патрэбна даць артыстцы, каб паказаць перад гледачом гэты вобраз такім, якім ён зроблен па замыслу аўтара.

Таксама бледна пададзен і вобраз бабкі Насты ў выкананні артысткі Маскалёвай.

Яшчэ больш прыкрае ўражанне робяць выкананне так-званых другарадных ролей арт. Магілзінай (Панас) і арт. Алешка (Алеся, дачка Аўгінні). Другарадных ролей па сутнасці ў тэатры няма. Усе ролі ў агульным ходзе спектакля каштоўныя, і выкананне іх нават без слоў часта стварае для артыста немалую цяжкасць. Гэта тт. Магілзінай і Алешка патрэбна ўлічыць і добра папрацаваць над кожным сваім рухам на сцэне. Да гэтага-ж трэба яшчэ дадаць, што тав. Алешка для выканання ролі Алесі проста не падыходзіць па ўзросту. Гэта «дробязь» адразу кідаецца гледачу ў вочы. А Панас у выкананні Магілзінай не падобен на сялянскага падростка, цвярозага і спрактыкаванага ў жыцці.

Спектакль «У пушчах Палесся» безумоўна з'яўляецца правільным крокам у творчым поступе калгаснага тэатра, хоць і назіраецца нейкая паспешнасць у падрыхтоўцы пастаноўкі, з прычыны чаго ў выкананні ролей асобных артыстаў адчуваецца значная недапрацаванасць вобразаў.

Мастацкае афармленне (мастак Чэртков) пастаноўкі надзвычай удалае, прыгожае, маляўнічае, што значна дапамагае гледачу ва ўяўленні цэласнасці вобразаў і сюжэту п'есы.

Пажадаем параўнальна маладому калгаснаму тэатру поспехаў у яго далейшым росце і развіцці. Мастацкаму-ж кіраўніку яго тав. Лізункову неабходна выправіць усе памылкі пастаноўкі «У пушчах Палесся».

М. КАРПАЧОЎ.



Новая Масква. На фота — будуемы цэнтральны тэатр Чырвонай Арміі на плошчы Комуны.

Гастролі самадзейнага ансамбля будаўнікоў па СССР

Гэтых людзей мы прывыклі бачыць на рукавах будаўніцтва. Апаясаныя фартухамі, апранутыя ў рабочыя камбінезоны, яны кладуць цэглу, кладуць падлогу, накрываюць дахі, прарубаюць дзверы, фарбуюць сцены. Тыя выдатныя будынкі, якія выраслі за апошні час у Менску і ўпрыгожылі сабою сталіцу, створаны іх рукамі. Сталінскія школы, жыллёвыя палацы, тэатры,—усё створана рукамі рабочых-будаўнікоў.

Іх асноўная прафесія—каменшчыкі, тынкары, плотнікі, кровельшчыкі, арматуршчыкі, сталяры, шкляры.

Але зараз, калі сцэна асветлена мяккім электрычным святлом, у зале пануе мёртвая цішыня і позіркі прыкаваны да клубных падмосткаў, дзе бадзёрая песня змяняецца ўдалымі танцамі,—вы наўрад ці пазнаеце ў гэтых людзях патомственных будаўнікоў. Народнае мастацтва ўзняла іх да акторскага майстэрства, і выступленне менскіх будаўнікоў цяжка адрозніць ад выступлення актораў прафесіяналаў.

Пачалося, як гэта характэрна для многіх самадзейных калектываў, з гурткавой работы ў клубе. Былі створаны два гурткі—харавы і балетны.

Чатыры месяцы назад, калі краіна рыхтавалася да выбараў у Вярхоўны Совет БССР і спатрэбіліся сілы для мастацкага абслугоўвання выбарчых участкаў, самі гурткоўцы прапанавалі свае паслугі. К гэтаму часу гурткі ўмацаваліся, іх выступленні карысталіся вялікім поспехам. Харавы і балетны гурткі зліліся ў адзін. Арганізаваўся першы ў БССР клубны ансамбль народнай песні і танцаў. У складзе ансамбля 60 чалавек. Кіруе ансамблем артыст Тэатра оперы і балета тав. Самсонаў; танцы ставіць тав. Даронін. У перыяд выбарчай кампаніі маладому ансамблю прышлося вытрымаць цяжкі экзамен. Найбольш здольныя ўдзельнікі ансамбля былі пасланы ў гастрольную паездку па Менскай вобласці. Экзамен быў здадзен. Выбаршчыкам спадабаўся малады ансамбль, яго радасныя песні, яго танцы.

У апошні час ансамбль падрыхтаваў вялікую мастацкую праграму. У асноўным яна складаецца з матэрыялаў, адлюсочых мінулае і сучаснае Беларусі.

Па ходу праграмы перад гледачамі праходзяць вядомыя беларускія танцы: «юрачка», «мяцеліца», «янка-полька», калгасныя частушкі з танцамі. У ансамблі паспяхова выступае тынкоўшчык Грынгауз і яго жонка, тынкоўшчык-стаханавец Кавалёў, які працуе на школьным будаўніцтве; будаўнікі Пятровіч, Мішутовіч, падсобная работніца Крыцкая і інш.

Зараз ансамблю прадстаіць вялікая ганаровая задача: упершыню клубны ансамбль выязджае ў вялікую гастрольную паездку па СССР. Паездка гэта зацверджана ЦК саюза рабочых комунальна - жыллёвага будаўніцтва СССР. З Менска ансамбль будаўнікоў у складзе 60 чалавек выязджае ў Маскву. Пасля некалькіх выступленняў перад маскоўскімі будаўнікамі ён паедзе ў Орол, з Орла ў Курск, затым—у Харкаў, Днепрапятроўск, Чэрнігаў, Кіеў.

Велізарнае значэнне будзе мець гэтая паездка. Яна ўзбагаціць таленавітых будаўнікоў новымі творчымі магчымасцямі, яна паслужыць далейшаму ўмацаванню брацкіх сувязей паміж будаўнікамі СССР.

Е. САДОЎСКІ.

ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ БЕЛДЗЯРЖЭСТРАДЫ

Каля 10 год у сталіцы БССР — Менску ціха і мірна існуе небезвядомая арганізацыя — Белдзяржэстрада. Шмат шыльдаў і гаспадароў змяніла на сваім вяку эстрадная арганізацыя, але справы яе ад гэтага не змяніліся. Нямала спісалі паперы «рацівыя» пісакі з Упраўлення па справах мастацтваў на загады аб рэарганізацыі і ўмацаванні Белдзяржэстрады, аднак усё ідзе па-старому. Апошнім гаспадаром эстрады з'яўляецца Белдзяржфілармонія. На вялікі жаль, і гэта аўтарытэтная арганізацыя работы Белдзяржэстрады не наладзіла. Кіраўнікі філармоніі тт. Г. Прагін і Б. Кагановіч аднесліся да Белдзяржэстрады як да пабочнага промыслу, абмежаваўшы сваё кіраўніцтва ёю выключна прадажай канцэртаў.

На сёнешні дзень калектыў Белдзяржэстрады складаецца з 7 актораў. Ясна, што такі штат ні колькасна, ні якасна не можа задаволіць тых вялікіх культурных патрабаванняў, якія прад'яўляюць нашаму мастацтву совецкія гледачы. У рэпертуары эстрады амаль зусім адсутнічаюць совецкія беларускія народныя песні і танцы, а таксама мастацкія творы совецкіх пісьменнікаў БССР. Упраўленне па справах мастацтваў і кіраўнікі Белдзяржфілармоніі, як відаць, недаацэньваюць немалаважнае пытанне, выхавання беларускіх кадраў эстрады і стварэння для яе рэпертуару

Зусім адсутнічае вучоба актораў эстрады. А між тым і Філармонія і Белдзяржэстрада, як вядома, аб'яднаны ў адну гаспадарчую адзінку. У Філармоніі ёсць не мала творчых кваліфікаваных кадраў, якія маглі-б сур'ёзна дапамагчы ў вучобе акторам Белдзяржэстрады. Зусім няма ў штаце Белдзяржэстрады рэжысёра, хоць сродкі на яго ўтрыманне адпушчаны. Тут віна выключна кіраўнікоў Філармоніі, якія не паклапаціліся падшукаць адпаведную кандыдатуру на гэту пасаду. Калі хто-небудзь з актораў пажадае паставіць той ці іншы эстрадны нумар, дык гэта прыходзіцца рабіць самому актору па асабістай дагаворанасці з рэжысёрамі тэатраў. Але калі акторы эстрады тт. Гільзінеп і Міхеда дамовіліся з балетмейстарам оперы аб пастаноўцы ім нумара, дык адміністрацыя Філармоніі не паклапацілася забяспечыць іх памяшканнем для рэпетыцый.

Ніхто не кіраваў і рэпертуарам эстрады, рэпертуар падбіраўся выключна па ўласнаму жаданню і густу актораў. На прагляды з'яўляліся грозныя адміністратары і гаварылі сваё «аўтарытэтнае» слова аб магчымасці прадажы нумара. «Прадажа» адбывалася па асабістаму меркаванню таго ці іншага адміністратара і гора было таму актору, які пасмеў крытыкаваць гэтага адміністратара: такі актор пазбаўляўся выступленняў на працягу цэлага месяца.

Становішча, якое стварылася ў Белдзяржэстрадзе, патрабуе тэрміновага аздараўлення. Патрэбна канкрэтная дапамога эстрадзе і з боку Упраўлення па справах мастацтваў і з боку саюза працмастацтваў.

Неабходна зараз-жа аддзяліць Белдзяржэстраду ад Філармоніі, забяспечыць яе адпаведным прападольным кіраўніцтвам. Трэба стварыць пры адкрываючайся драмшколе спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы акторскіх кадраў для эстрады. Трэба забяспечыць эстраду адпаведным мастацкім кіраўніцтвам і ўключыць у яе рэпертуар творы пісьменнікаў Совецкай Беларусі і братніх рэспублік. У гэтым пытанні Белдзяржэстрадзе павінна дапамагчы драмсекцыя ССПБ.

У. СТЭЛЬМАХ.

„НАШЫ ДНІ“ ЯКУБА КОЛАСА

Якуба Коласа чытач любіць і паважае за яркія вобразы яго аповесцей, драм і паэм, ведае напамяць рад яго вершаў.

Выхад з друку новай кнігі, у якой сабраны вершы за чатырнаццаць год (1922—1936) — не малаважная падзея для чытача. Ен хоча пазнаёміцца з новымі творамі, убачыць у яркіх мілагучных радках нашу рэчаіснасць, разам з паэтам усхваляваны і глыбока яе перажыць. Ужо сама назва зборніка «Нашы дні» гаворыць за сябе. Сталінская Канстытуцыя, яе геніяльны тварэц таварыш Сталін, шчаслівае жыццё з яго новымі людзьмі, рэволюцыйныя святы, гераічная барацьба іспанскага народа супроць фашыстаў і інш., — усё гэта знайшло сваё адлюстраванне ў зборніку. Аднак, не ўсе вершы аднолькавай грамадскай вартасці і мастацкай якасці. Меншая частка зборніка — лепшыя вершы, якія напісаны за апошнія два-тры гады. І другая частка — слабыя вершы, якія псуюць зборнік. Аўтар зрабіў не строгі адбор пры складанні кніжкі, уключыўшы ў яе амаль усё, што было ім напісана за апошнія 14 год.

Рад вершаў чытач прачытае са задавальненнем. Напрыклад, верш «Шчаслівая хвіліна». Тут поўна выражана радасць калгасніцы-маці. Дзень яна працавала ў полі, а цяпер, ідучы з дзіцячых ясляў, шчаслівая і радасная размаўляе з сынам. Яна рада, што сын яе ў гэты час быў прыгледжаны, што ў яго было шмат цацак і ён не плакаў. Маці рада: падрасце сын — і яму ўсе дарогі адкрыты, ён сам можа выбіраць сабе жыццёвы шлях і быць кім пажадае. Яна марыць аб часе, калі сын стане пілотам. Яна з гордасцю гаворыць:

Пралеціш над нашым полем
Ты на самалёце,
Калі я там, мой сокалю,
Буду на рабоце.

Верш напісан проста і выразна. Ідэя клопатаў совецкай улады аб дзецях выказана тут не ў агульных развагах ці апісаннях, а падана праз пачуцці маці. Таму вершаваныя радкі набываюць асаблівую цеплыню і шчырасць. Ласкаючы сына, маці знаходзіць цёплыя, пяшчотныя словы. Тут мастацкія сродкі арганічна зліваюцца з вобразам маці. Іменна сялянка магла сказаць такія словы свайму сыну.

Брыгадзір ты мой удалы,
Цвецік свежы, макаў.

Ці:

А сын мой чысты, мыты,
Маладзічок ясны.

Паэт умее знайсці правільны тон — суровы і гнеўны, гаворачы пра гераічную барацьбу іспанскага народа з фашысцкімі выродкамі. Верш «Іспаніі» выгодна вылучаецца сярод нешматлікіх вершаў у беларускай літаратуры на гэтую тэму. Чытач прачытае яго з цікавасцю і задавальненнем, бо ён выказвае настрой совецкага грамадзяніна, нянавісць да фашысцкіх катаў.

Цікавы высокамастацкія вершы «Песні салдаткі» і «Салдацкая песня»

«Песня салдаткі» падкупляе чытача лірычнасцю. Туга па мужу салдаткі, якая адна засталася з малымі дзецьмі, перададзена паэтам прачута і ўсхвалявана. Сум яе перадаецца праз прыроду. Салдатка звяртаецца да сонца, месяца і зор, каб яны адказалі, дзе яе муж: «ці забіты, ці ў чужым палоне?»

Песня напісана простай мовай, блізкай да народнай, што робіць яе праўдзівай. Напрыклад, жанчына выказвае сваё гора і сум:

Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна.
Гора мне адненькай,
Сумна маладзенькай.

Прастата і яснасць радка, элементы народнасці ў мове характэрны і для некаторых іншых вершаў. Верш «Сталінская Канстытуцыя», «Праваднру народаў», «У майскія дні», «Песнярам совецкай зямлі» і «Раскуты Праметэй» — уваходзяць у актыў зборніка. Чытач іх належна ацэніць і будзе ўдзячны аўтару.

У зборніку ёсць і некалькі прыродаапісальных вершаў. Напрыклад, апісваецца чароўнасць ночы, вясны, Каўказа. Хто з беларускіх паэтаў за апошнія годы можа пахваліцца прыродаапісальнымі вершамі? А пра неабходнасць стварэння новага совецкага пейзажу завайстрыў увагу Аляксей Максімавіч Горкі ў сваім дакладзе на Першым усесаюзным з'ездзе совецкіх пісьменнікаў. Для паэтаў тут яшчэ непачаты край работы. У гэтым аспекце вышэйадзначаныя вершы Коласа набываюць вялікую цікавасць.

Як дадатны бок, трэба адзначыць разнастайнасць тэм і формы. Але, як мы ўжо вышэй адзначалі, увесь зборнік — не на ўзроўні лепшых вершаў. Рад вершаў трэба было проста ў кніжку не ўключаць.

Другі верш «Янку Купалу» з'яўляецца зніжэннем грамадскай значнасці паэзіі. У гэтым вершы паэт выказвае думку, што яму вельмі балюча (і нават слава не міла), калі іх хто-небудзь назаве «старымі». Гэтыя «злыя нагаворы», па аўтару, робяцца з нейкай дзікаватай мэтай:

Ды «старымі» завуць нас па злобе.
Есць на гэта прычыны, —
Каб нас проста, як кажуць, угробіць(?).

А за што? З-за жанчыны(?!).

І тут аўтар кажа, што калі ён пачуе яшчэ раз гэтае слова, дык:

На ўвесь свет пратэст пракрычу я,
Заяўлю ў Лігу нацый.

Бясспрэчна, што гэта не сур'ёзны верш, але і жартаўлівым яго назваць таксама нельга, — гумару не атрымалася. Тое-ж можна сказаць і пра другую палову верша «Змітраку Бядулю», у якім паэт звяртаецца да Бядулі з наступнымі радкамі:

І не зважай на «нашатыркі»,
Ідзі з эпохаю ўпарод.

Сэнс гэтых радкоў з «нашатыркамі» можа толькі разумець вузкае кола пісьменнікаў, а не масавы чытач. Радкі, у якіх Якуб Колас гаворыць Бядулю, што ён: «Прышоў у фокус нашых дзён» і што ў яго:

Гуменца на макушы,
Як месяц свеціць праз туман;

ці радкі з другога верша «Піонерам», дзе аўтар гаворыць ім:

У кастрычніцкай віхуры
Карані вашай натуры, —

гучаць прымітывам і непатрэбным спрашчэннем паэзіі.

Ад такога паэта, як Колас, чытач управе патрабаваць больш глыбокіх філасофскіх абагульненняў і паэтычных узлётаў. А ў кнізе мясцінам сустракаеш прыкрыя спрашчэнні паэзіі.

Аб калгасным жыцці ён часамі піша агульна, вобразы стварае далёка не пераканаўчыя. Напрыклад, у вершы «Таніна тайна» Колас перадае пачуцці дзяўчыны Тані, якая задумала: «Перакрыць, пабіць рэкорды сваёй прыяцелькі Насці». Наколькі яе пачуцці перададзены праўдзіва і як характэрызуюць нашу калгасніцу? Звернемся да саміх вершаў:

Ходзіць Таня ў задуменні,
Хмурыць бровы.
І:
Заклапочан твар у Тані,
Зораць вочы
Дзесь далёка.
Таня нават дайшла да таго, што:
Песень не спявае
І не ходзіць
На гулянкі.

Бясспрэчна гэта не жывы чалавек, а шаблон, створаны літаратурай, далёкі ад жыцця, і Колас яго паўтарыў у сваім вершы.

Альбо яшчэ для прыкладу ўзяць верш «Калгасу «Слабада». Пачынаш чытаць: верш як верш. Настрайваешся сур'ёзна ўскрываць яго:

Жанчыны, як вішні, мужчыны дубы,
А хлопцы, дык хлопцы—гвардзеец
любы.

Далей даведваешся, што ўсе ў калгасе працавітыя і дружныя. Дзеці тут вясёлыя, жывыя, якіх не было ў старых вёсках, і раптам верш заканчваецца такімі словамі:

Глядзіш, і вясною квітнее душа
Не каюся нават, што выпіў «ярша».

Калі-б гэта было апісанне якога калгаснага свята, дык можна было-б дараваць аўтару ўспамін аб чарцы гарэлкі, а ў далым выпадку гэта гучыць непатрэбна і псуе ўвесь верш. Чытач хацеў убачыць жыццё калгаснікаў у калгасе «Слабада», але такога малюнка ў вершы ён не знайшоў. Скончыўшы чытаць верш, ён адчувае прыкрасць і нездавальненне. Лыжка дзёгцю псуе бочку мёду. Нажаль, гэта не адзіны прыклад у зборніку. Сустракаюцца вобразы, якія не дапамагаюць глыбей і больш мастацка раскрыць ідэю верша, нават часам не дапасуюцца да матэрыялу, на якім напісан верш. Напрыклад:

Балотам зрабілі **шах і мат**
І будуць нівы на балоце.
«Шах і мат» — да балота нельга дапасаваць пры ўсім жаданні.

Ці:

Слепнёў, Каманін і Молакаў хмуры,
Дастойны вы песні вялікіх паэтаў.

Эпітэт «хмуры» тут ні к чаму. Хто ўважліва сачыў за нашымі кіножурналамі і хто бачыў кінакарціну «Па слядах героя», той ведае, што, наадварот, Молакаў адзін з самых вясёлых і абаяльных людзей.

У Коласа багатая мова, але тым больш прыкра чытаць побач з багаццем мовы такія словы і звароты: аковы, паўны, напрог, усплыў месячак на ўзвыш, ідуць гады сталёвым шыхам.

Колас мае рад пудоўных твораў якімі зачытваюцца і будуць зачытвацца. З героямі яго аповесцей чытач знаём як з самымі блізкімі яму людзьмі. Паэма «Новая зямля» — класічная рэч беларускай літаратуры. Колас мае і шмат добрых вершаў, у гэтым зборніку таксама ёсць добрыя вершы, але цалкам зборнік слабей за ўсе астатнія творы, якія Коласам выдаваліся за апошнія годы. Чытач добра ведае творчасць Коласа, любіць усё добрае з яе і таму ў кожным новым творы патрабуе ад паэта высокай якасці. Коласу чытач не прывык даравать недарэчнасці, спрашчэнні і эпігэміі паэзіі. З вялікага паэта многае і патрабуецца. Мы жадаем, каб Колас сваімі новымі вершамі задаволіў высокае патрабаванне паважаючых і любячых яго чытачоў.

Андрэй УШАКОЎ.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды» Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76. Дом пісьменніка Тэлефон 25-394 Уп. Галоўлітбелу № Е—5805.